№ 47 (597) 18 снежня 2008

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыдня, у чацьвяргі




**Сэкс і молат**

Старонка 9



**Новы праект Вольскіх**

Старонка 12

**Тэлепраграма «Белсату» на тыдзень**

Старонка 15

**У НУМАРЫ**

**З верай у Лукашэнку**

У Мінску прайшла акцыя індывідуальных прадпрымальнікаў, якая сабрала каля 3000 чалавек. **Старонка 6.**

**І ботам не кінуў**

Блогер nn.by Аляксандр Класкоўскі сустрэўся з Джорджам Бушам. Уражанні. **Старонка 2.**

**Мужык павінен біцца**

Існуе «раман выхавання», а беларускі блогер Andorac піша «эсэ выхавання». Пра падлеткавыя баі. **Старонка 13.**

**«ARCHE» і «Наша Ніва» ў Смаргоні**

19 снежня ў пятніцу а 19.00 у Смаргоні па адрасе вул. Чырвонаармейская, 24 адбудзецца прэзентацыя Збору твораў ксяндза Адама Станкевіча «З Богам да Беларусі» з удзелам гісторыка Алеся Пашкевіча, паэта Уладзіміра Някляева і рэдактара ARCHE Валера Булгакава. Даведкі праз т.: 336-20-62 (Аляксандр).

Будзе працаваць выстава беларускіх кніжак і часопісаў. Запрашаем усіх жадаючых зрабіць сабе калядныя падарункі.

# Снягір у клетцы. Некаторыя загадкі


PHOTOBYMEDIA.NET

**Арыштаваны былы пракурор Мінскай вобласці Міхаіл Снягір... Як набываюць нерухомасць моцныя людзі Рэспублікі Беларусь... Старонка 3.**

# Мілінкевіча легалізавалі

**Рух за Свабоду стаў першай значнай апазіцыйнай структурай, зарэгістраванай за апошнія 8 гадоў.**

17 снежня Аляксандра Кавальца выклікалі ў Міністэрства юстыцыі, дзе ўручылі пасведчанне аб рэгістрацыі Руху за Свабоду. Гэта была поўная нечаканасць для актывістаў руху, лідэрам якога з'яўляецца былы кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Мілінкевіч. Цяпер афіцыйная назва Руху будзе гучаць як Праваабаронча-асветніцкае грамадскае аб'яднанне Рух за Свабоду.

Дакументы на рэгістрацыю прыхільнікамі Мілінкевіча падаваліся ажно чатыры разы, але Мін'юст увесь час знаходзіў нейкія зачэпкі, каб адмовіць. Разам з тым, кіраўніцтва Руху настойліва працягвала гнуць сваю лінію. Кавалец заяўляў, што дакументы будуць падавацца да той пары, пакуль рэгістрацыя не будзе атрыманая.

Намеснік старшыні Руху за Свабоду Юрась Губарэвіч кажа: «Дакументы былі пададзеныя бездакорнымі і фармальна адмовы не павінна было быць. Спадзяюся, што гэты выпадак не стане адзінкавым, і будуць задаволеныя заявы іншых дэмакратычных арганізацый, якія падалі дакументы на рэгістрацыю».

Беларускія ўлады працягваюць выконваць патрабаванні Еўрасаюзу. Следам за вызваленнем палітвязняў і вяртаннем у дзяржаўныя сістэмы распаўсюду двух незалежных газет, рэгістрацыю атрымала адна з найбольш шматлікіх палітычных сіл у краіне.

**Зміцер Панкавец**

**КАМЕНТАР**

**Няўжо ўсё так дрэнна?**

З чацвёртай спробы зарэгістраваны Рух за Свабоду. Лукашэнка хоцькі-няхоцькі працягвае выконваць патрабаванні Еўропы. Хай фармальна, хай у гадзіну па чайнай лыжцы, але саступае.

Пусціў у шапікі пару незалежных выданняў, а вось цяпер і дзецішча свайго галоўнага канкурэнта па апошняй прэзідэнцкай кампаніі легалізаваў. Няўжо справы ў эканоміцы проста швах? Няўжо запасы вычэрпваюцца? Мабыць, так і ёсць, раз Лукашэнка ідзе сабе насуперак.

Першую траншу расійскага крэдыту глынулі і не заўважылі. Падтрымка валютнага курсу вымагае велізарных сродкаў. Калі тэмпы інтэрвенцый Нацбанку захаваюцца, золатавалютныя запасы Беларусі скароцяцца на мільярд даляраў за адзін гэты месяц. У такой сітуацыі патрэбныя грошы чортавага Захаду. Вось ужо і заробак скарацілі і рубель пачалі дэвальваваць.

У палітычным плане рэгістрацыя Руху прывядзе да аслаблення ролі палітычных партый, расчараванне якімі вялікае. Самыя актыўныя рэгіянальныя лідэры сабраліся ў Руху за Свабоду. Цяпер вакол гэтай легальнай арганізацыі будуць гуртавацца і многія партыйныя актывісты.

**Сямён Печанко**

# І ботам не кінуў

**Блогер nn.by Аляксандр Класкоўскі сустрэўся з Джорджам Бушам.**

Буш зайшоў нечакана, не праз тыя дзверы, на якія ўсе глядзелі. Я на яго шляху апынуўся першы. Прэзідэнт працягнуў руку, як стары знаёмы:

— Хэлоў, Аляксандр!

Ідэнтыфікаваў умомант. То бок да гутаркі рыхтаваўся і ўважліва прагледзеў давéдкі на гасцей.

Ідэя арганізатараў была такая: на Дзень правоў чалавека сабраць у Белым Доме тых, хто выступае за гэтыя самыя правы ў краінах, дзе іх браке. А каб надаць імпрэзе мадэрну, выбралі вузейшы кантэкст: блогеры, прадстаўнікі новых медый, у барацьбе за правы чалавека. Так і апынулася ў Вашынгтоне наша пярэстая кампанія: прадстаўнікі Бірмы, Кітаю, Ірану, Кубы, Беларусі, Егіпту, Венесуэлы.

Не буду пераказваць гадзінную гутарку, сканцэнтруюся на тым, як гучала ў гасцёўні Рузвельта (так называецца гэты пакой рэзідэнцыі) беларуская праблематыка.

Адчувалася: Буш сапраўды ганарыцца тым, што Мінск быў змушаны выпусціць палітвязняў. Лічыць гэта дасягненнем, хай сабе і прамежкавым, у справе разгрызання беларускага цвёрдага арэшка.

Я ж імкнуўся давесці, што цяпер ключавой становіцца праблема свабоды выказвання, разняволення СМІ ў Беларусі. Падчас мінулых выбараў усе ўбачылі: крыхі галоснасці з панскага стала (лімітаваныя «гаваркія галовы» ў тэлевізары) — не вырашэнне праблемы. Свабода СМІ патрэбная не для падтрымкі палітычнай апазіцыі. Гэта патрэбна, каб у нашай краіне паўстала грамадзянская супольнасць, каб лёс Беларусі не вырашаўся над галовамі безгалосага электарату.

Буш паказаў на Вольгу Казуліну, дачку былога палітвязня №1. Вось яна балатавалася ў парламент — вы, Аляксандр, яе падтрымлівалі як журналіст? Кажу: ведаеце, увогуле ў сваіх артыкулах я праклaмую тое, што, спадзяюся, на карысць і апазіцыі таксама. Але калі стану абслугоўваць палітыкаў, то чым я буду адрозніваца ад афіцыйных журналістаў? Я бачу місію СМІ не ў тым, каб рабіць рэвалюцыю, а ў тым, каб даваць інфармацыю, сумленны аналіз, даносіць праўду.

Буш пацікавіўся: ці страшна ў вас казаць уголас тое, што не падабаецца ўраду? На фоне блогераў з Ірану, Бірмы маляваць сябе вялікім героем было няёмка. (Практычна ўсе астатнія блогеры, што былі на сустрэчы, мусілі эміграваць. Іранец — пасля таго, як адседзеў у турме.) Кажу: у нас краіна кропкавых рэпрэсій. Аднаго пасадзяць — тысячы баяцца.

Буш спытаўся: ці можа беларускае кіраўніцтва сапраўды шчыра пайсці насустрач Захаду? Сэнс майго адказу быў такі: наіўна думаць, што яно загарэлася ідэямі дэмакратыі ды прасяклося піетэтам перад правамі чалавека. Але бяруць за горла два чыннікі: Расія і фінансавы крызіс. На саступкі даводзіцца ісці праз не хачу. Вось тут узнікае і выклік для Захаду: як скарыстаць гэтае акно магчымасцей.

**Працяг на старонцы 5.**



**Блог**

**дзённік, які адкрыта вядзецца асобай у інтэрнэце і даступны іншым людзям для прагляду. Блогі на сайце NN.BY вядуць Аляксандр Класкоўскі, Юлія Дарашкевіч, Сяргей Астравец, Андрэй Расінскі.**

# Журналісты «НН» — лаўрэаты прэмій

Адразу двое журналістаў «Нашай Нівы» на мінулым тыдні сталі лаўрэатамі праваабарончых прэмій.

Журналіст **Сямён Печанко** атрымаў першую прэмію «Праваабарончага альянсу», які ўзначальвае Людміла Гразнова. Гэтай вясной Сямён адседзеў пятнаццаць сутак за кратамі за асвятленне Дня Волі.

Таксама «Альянсам» была адзначаная праца ў галіне абароны правоў чалавека юрыста Барыса Звоскава і адваката Тамары Сідарэнкі, якая абараняла Андрэя Кіма.

Фатограф **Юлія Дарашкевіч** атрымала штогадовую прэмію «Хартыі-97» у намінацыі «За адстойванне прынцыпаў свабоды слова». «Дарашкевіч прадстаўляе тых адважных беларускіх журналістаў, якія, нягледзячы на ціск з боку ўлад, працягваюць прафесійна выконваць свае абавязкі», — гаворыцца ў заяве аргкамітэта.

Астатнімі лаўрэатамі прэміі «Хартыі» сталі былыя палітвязні Андрэй Кім, Сяргей Парсюкевіч, Аляксандр Баразенка, а таксама праваабаронца Галіна Юбко.

**ЗП**

# Чаму наша газета дарагая?

«Наша Ніва» каштуе даражэй за лукашэнкаўскія газеты, бо не атрымлівае ні капейкі з бюджэту. Тыраж малы, у той жа час газета каляровая і якасная. Незалежныя газеты пазбаўленыя рэкламы, і гэта таксама прычына іх дарагоўлі.

«Наша Ніва» даражэйшая за «Народную волю», бо «Наша Ніва» друкуецца ў колеры і мае ўтрая меншы тыраж. «НН» арыентуецца на сярэдні слой, тады як «Народная воля» — на больш масавага чытача.

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.
2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».
3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю **10 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

Від аплаты | Дата | Сума
За газету "Наша Ніва"

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

Від аплаты | Дата | Сума
За газету "Наша Ніва"

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічалі грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Ліане Ш., Дзмітрыю Р., Юрыю Ш., М.Б., Мікалаю К., Уладзіміру С., Кірылу М., Нелі А., А.К., Сяргею К., Эдуарду К., В.Г., В.В., Мікалаю П., А.Л., К.М., Уладзіміру С., Юрыю Л., І.Г., А.Т., Л.С., Мікалаю П., Л.Г., Аляксандру К., Я.А., Людміле І., Леаніду Л., Таццяне К., Ю.В., А.А., Мікалаю П., Анатолю С., А.Р., М.А., В.В., Івану А., Надзеі М., С.К., Таццяне В., Рэгіне Б., Мікалаю С., Н.Б., В.М., Уладзіміру М., Алесю С., Марыі П., Ігару Г., Аляксандру С., І.В., Ніне Ш., А.С., Н.Б., Ірыне Ц., Івану Л., Івану К., Вячаславу Р., Ігару Б., Фёдару П., Святлане К., Міхаілу Ж., Альберту С., Георгію Ш.** з Мінску.

# Снягір у клетцы. Некаторыя загадкі

12 снежня арыштаваны былы пракурор Мінскай вобласці Міхаіл Снягір. Зрэшты, вестка пра арышт з'явілася толькі праз чатыры дні. Снегіру прад'яўлена абвінавачанне паводле артыкулу 424 КК «Злоўжыванне ўладай і службовымі паўнамоцтвамі». Максімальныя санкцыі паводле гэтага артыкулу — 10 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Паводле некаторай інфармацыі, у следчым ізалятары ў Снегіра адразу здарыўся сардэчны прыступ, таму яго пад аховай міліцыянтаў перавялі ў бальніцу.

Справа Снегіра ўсплыла 13 лістапада на нарадзе ў Лукашэнкі па барацьбе з карупцыяй. Кіраўнік дзяржавы сказаў, што ў маі 2007 году Снягір набыў па заніжанай цане ў аднаго камерсанта 5-пакаёвую кватэру ў цэнтры Мінска агульнай плошчай за 200 квадратных метраў. Кватэра была набытая за 156 мільёнаў рублёў, ці то 72 тыс. даляраў, у той час яе рынachны кошт складаў каля 500 тысяч даляраў.

Было зазначана, што кватэра набытая з парушэннем закону, бо Снягір набыў кватэру ў чалавека, які не меў права прадстаўляць інтарэсы фірмы-ўласніка. А тым больш у кватэры пражываў грамадзянін Сідаровіч, у якога была арэндная дамова аж да 2024 году. У сваю чаргу газета «Беларускі партызан» сцвярджае, што кватэра Снегіром купленая абсалютна законна. Перад сваім другім прызначэннем на пасаду пракурора Мінскай вобласці Снягір падаваў дакументы на праверку ў Раду Бяспекі. І тады ніякіх прэтэнзій не было.

Звяртае ўвагу і тое, што перад набыццём кватэры на вуліцы Грыбаедава Снягір прадаў нятанную трохпакаёўку ў Траецкім прадмесці.

Што датычыць Уладзіміра Сідаровіча, то ён яшчэ ў 1999 г. заключыў з прадстаўніцтвам шведскай фірмы Swe-Bel Partner AB, у якой працаваў, пагадненне аб арэндзе кватэры на 25 гадоў. У 2007 годзе Swe-Bel Partner AB фактычна збанкрутавала і з радасцю прыняла прапанову Снегіра аб продажы кватэры.

Уладзімір Сідаровіч пасля гэтага неаднаразова звяртаўся ў Генеральную пракуратуру, а таксама суд Цэнтральнага раёну сталіцы, але яны ўвесь час займалі пазіцыю Снегіра. Пісаў лісты Сідаровіч таксама ў Адміністрацыю прэзідэнта, КДК, Раду Бяспекі, але і яны абмяжоўваліся фармальнымі адпіскамі. Тагачасны кіраўнікі Рады Бяспекі Віктар Шэйман проста перанакіроўваў справу ў Генпракуратуру.

Праз нейкі час суддзя Цэнтральнага раёну Мінска Алена Ільіна, загадзя па тэлефоне ўзгадніўшы пазіцыю са Снегіром, прыняла рашэннем выселіць грамадзяніна Сідаровіча з кватэры. Зрэшты, намераў здавацца ў гэтай справе Сідаровіч не меў.



**Апошні карупцыйны скандал прывёў да ўзмацнення Віктара Лукашэнкі (у ніжнім шэрагу з жонкай) і Уладзіміра Макея (зверху злева, з Уладзімірам Замяталіным).**

На той самай нарадзе Лукашэнка казаў, што Снягір будуе яшчэ адзін дом ля Цнянскага вадасховішча, які «выглядае больш унушальна за рэзідэнцыю прэзідэнта». Па візуальных адчуваннях кіраўніка краіны катэдж каштуе не меней за мільён даляраў. Зрэшты, падобных асабнякоў на Цнянцы і ў тых жа Драздах нават не дзесяткі, а сотні. А вось для публічнага паказу выбраны быў менавіта снегіроўскі. «Дзе пракурор узяў грошы?» — крычаў Лукашэнка.

> У 2000 годзе пастанову аб арышце Дзмітрыя Паўлічэнкі падпісаў менавіта намеснік генпракурора Снягір.

Была дадзеная каманда цягам дзесяці дзён катэдж канфіскаваць і перадаць яго якой-небудзь «шматдзетнай сям'і». Па дакументах асабняк аформлены не на Снегіра, а не нейкага бізнесмена, які даў паказанні, што грошы на домік яму даваў пракурор. Каля будоўлі часта бачылі і сваякоў пракурора Міншчыны.

Лукашэнка дадаў і яшчэ адзін цікавы штрых да характарыстыкі Снегіра. Да пракурора звярталіся сябры-прадпрымальнікі з просьбай прыбраць канкурэнта і адмяніць рашэнне Найвышэйшага гаспадарчага суду. Тады Снягір праявіў надзвычайную актыўнасць. У Найвышэйшым гаспадарчым судзе справу вырашыць не выйшла праз «прынцыповую пазіцыю» Смірнова (былы намеснік старшыні Найвышэйшага гаспадарчага суду). Але тут на дапамогу зноў прыйшоў другі абвінавачаны ў карупцыйным скандале — намеснік генеральнага пракурора Купрыянаў.

Чаму ахвярай антыкарупцыйнага скандалу стаў менавіта Снягір? Ён нічым не лепшы і не горшы за многіх іншых пракурорскіх работнікаў. Магчыма, што Снягір проста не з тым звязаўся. Бо кажуць, Сідаровіч цесна звязаны з КДБ, дзе захаваў добрыя сувязі. Даклад Лукашэнку рыхтавала менавіта ведамства Зайцава з дапамогай камітэту дзяржкантролю.

Не выключана, што сваіх катэджаў Снягір мог пазбыцца і праз асабісты канфлікт з Зянонам Ломацем. Зацікаўлены ў пераразмеркаванні роляў у пракуратуры і новы кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей. Снягір быў усё ж прадстаўніком старой гвардыі. Гавораць, што і сёння ён захоўвае добрыя стасункі з былым генеральным пракурорам Алегам Бажэлкам.

Зрэшты, хмары над пракурорам збіраліся яшчэ раней. Роўна год таму быў звольнены пракурор Мінскага раёну Ігар Шкатула. Прычына — масавы захоп блізу сталіцы зямельных надзелаў і незаконны продаж зямлі для будаўніцтва катэджаў. Тады ўпершыню ў СМІ трапіла інфармацыя пра катэджык Снегіра. Казалі, што ён можа пазбыцца пасады, але тады кантракт з ім падоўжылі.

Яшчэ адзін немалаважны факт: у 2000 годзе пастанову аб арышце Дзмітрыя Паўлічэнкі падпісаў менавіта намеснік генеральнага пракурора Міхаіл Снягір. Гэта значыць, акурат ён валодае шмат якой інфармацыяй па справах знікненняў вядомых праціўнікаў Аляксандра Лукашэнкі.

Ясна адно: за карупцыйнымі праваламі ў самым сэрцы вертыкалі праглядаюцца даўнія і цёмныя спляценні інтарэсаў.

**Зміцер Панкавец**

**Міхаіл Снягір**

**нарадзіўся 5 лістапада 1954. Скончыў юрыдычны факультэт БДУ. Прайшоў шлях ад памочніка пракурора Заводскага раёну Мінску да намесніка Генеральнага пракурора. Быў дэпутатам палаты прадстаўнікоў першага склікання. Г.зн. падтрымаў Лукашэнку ў часе перавароту 1996 году.**

# «Снягір разлічыўся за кватэру»,
## або Як набываюць нерухомасць моцныя людзі Рэспублікі Беларусь

**Кіраўнік кампаніі «Swe-Bel Partner» у адкрытым лісце раскрыў пікантныя падрабязнасці з жыцця набліжанага да ўладаў бізнесу.**

18 лістапада ў рэдакцыю парталу tut.by прыйшоў ліст ад старшыні праўлення АТ Swe-Bel Partner AB Анатоля Зубоўскага, які цяпер жыве за мяжой. Ён паведаміў, што накіраваў звароты ў Адміністрацыю прэзідэнта і пракуратуру ў звязку з падзеямі, пра якія стала вядома на тым тыдні на нарадзе ў пытаннях карупцыі. Ён кажа: «Мне крыўдна і балюча, што праз нашы адносіны з Сідаровічам пацярпелі людзі. Я бачыў Снегіра толькі раз у сваім жыцці — 15 гадоў таму... Я магу пацвердзіць, што ён цалкам разлічыўся з намі, заплаціў фірме 250 тысяч даляраў... Кожнае сваё слова я магу пацвердзіць дакументамі, за подпісамі Уладзіміра Сідаровіча. А Сідаровіч — зусім не такая „бедная авечка", як пра яго кажуць, — распавёў А.Зубоўскі.

Далей ён растлумачыў, што кіраўніцтва вырашыла прадаць кватэру, каб выйсці з складанага фінансавага становішча, у якім, ён мяркуе, фірма апынулася менавіта з віны Уладзіміра Сідаровіча. Пры гэтым самому Сідаровічу кіраўніцтва фірмы неаднойчы прапаноўвала прадаць кватэру за 150 тысяч даляраў, хоць яе рынкавая цана складала 500 тысяч даляраў ЗША.

А.Зубоўскі знаходзіцца за межамі Беларусі — «з прычынаў, якія тычацца толькі мяне і маёй сям'і». Паводле Зубоўскага, У.Сідаровіч знаходзіцца ў Беларусі, але яго асобай «чамусьці ніхто не цікавіцца».

Як паведаміў А.Зубоўскі, АТ Swe-Bel Partner AB цяпер знаходзіцца ў стадыі ініцыяванага банкруцтва. Вось поўны тэкст звароту Анатоля Зубоўскага, накіраванага прэзідэнту і генпракурору:

«Паважаны спадару Прэзідэнт!

Звяртаюся да Вас у сувязі з Вашым выступам па пытаннях барацьбы з карупцыяй у сілавых структурах ад 13 лістапада гэтага году.

Я, Зубоўскі Анатоль Сцяпанавіч, з 1994 году і да цяперашняга часу — старшыня праўлення фірмы АТ Swe-Bel Partner AB. Я працаваў сумесна з спадаром Сідаровічам У. у фірме АТ Swe-Bel Partner AB з 1995 да 2002 году.

Увесь гэты час Сідаровіч з'яўляўся не проста шараговым супрацоўнікам на пасадзе фінансавага дырэктара, але і яе ўласнікам. Яму належала 40% акцыяў АТ Swe-Bel Partner AB і ўсіх іншых фірмаў, што ўваходзяць у холдынг.

У снежні 2001 году сп. Сідаровіч на ўласнае жаданне выйшаў з бізнесу і атрымаў 40% усіх актываў холдынгу, каля 20 000 000 даляраў ЗША, у тым ліку:

офіс у Маскве,
паліграфічную фабрыку ў Санкт-Пецярбургу,
фірму па рамонце нафтавых свідравін у Цюмені,
дзве кватэры ў Маскве,
тры кватэры ў Мінску,
акцыі фірмаў на Кіпры і ў Аўстрыі,
завод па вытворчасці метвырабаў у Літве
і іншыя актывы.

У студзені 2002 году ў выніку ўнутранай праверкі было ўстаноўлена, што сп. Сідаровіч, з'яўляючыся фінансавым дырэктарам, перавёў 8 000 000 даляраў ЗША з рахунку холдынгу па невядомых бескантактных адрасах. У сувязі з гэтым падзел холдынгу быў прыпынены, пачаліся судовыя разбіральніцтвы, якія ідуць і цяпер. Так, у прыватнасці, цяпер на Кіпры разглядаецца пазоў да сп. Сідаровіча на суму 24 500 000 даляраў ЗША, прыўлашчаных ім асабіста і фірмай Fagapito — LTD.

Кватэра, у якой, як Вам даклалі, пражываў «бедны супрацоўнік» Сідаровіч была перададзеная яму ў арэнду. Пачынаючы з 2002 году і да траўня 2007 яму неаднойчы прапаноўвалася набыць гэтую кватэру за 150 000 даляраў ЗША, але ён гэта рабіць адмовіўся, відаць, таму, што ад «беднасці» сваёй пабудаваў катэдж у раёне вадасховішча Пціч, прыўласціў незаконна яшчэ адну кватэру ў тым самым доме, якую прадаў.

У сувязі з вышэйвыкладзенымі абставінамі, у маі—чэрвені 2007 году гэтая кватэра была прададзеная сп. Снегіру М. за 535 млн беларускіх рублёў (у эквіваленце 250 000 даляраў ЗША). Грошы былі атрыманыя ад пакупніка ў поўным аб'ёме.

Не ў маёй кампетэнцыі разбірацца і ацэньваць ступень карупцыі, удзел у ёй канкрэтных асобаў, я проста хачу звярнуць Вашу ўвагу на тое, што пададзеная Вам інфармацыя па кватэры сп. Сідаровіча хлуслівая і падманлівая. Менавіта той, хто Вам яе падаў, магчыма, атрымаў ад «бедняка» Сідаровіча салідны «куш».

Мэта майго звароту адна: калі Вы будзеце зацікаўленыя ў праўдзе па гэтым пытанні, прашу Вас даручыць незацікаўленым і прыстойным людзям разабрацца ў гэтым. Са свайго боку я гатовы падаць усю неабходную інфармацыю.

З павагай!

Старшыня Праўлення АТ Swe-Bel Partner AB Анатоль Зубоўскі»

Паводле інфармацыі «Белорусского партизана», Сідаровіч у мінулым працаваў у КДБ. А Зубоўскі быў да 1991 г. дырэктарам Мазырскага нафтаперапрацоўчага заводу. У той час ён быў і дэпутатам Вярхоўнага Савету.

**Паводле tut.by**

# След Снегіра

**Прозвішча экс-пракурора Мінскай вобласці Міхаіла Снегіра згадвалася ў СМІ з розных нагодаў. Адна з іх — справа Кацярыны Юбко.**

Ад 2004 году жыхарка Мінску Галіна Юбко дабіваецца справядлівага следства па факце смерці яе сястры Кацярыны. Паводле версіі жанчыны, следства пачалося з парушэннямі, вялося павярхоўна. Г.Юбко ўзялася весці ўласнае следства і здолела дамагчыся ўзбуджэння крымінальнай справы. За чатыры гады, што мінулі з моманту трагедыі, у турме памёр адзін з абвінавачаных у забойстве пенсіянеркі, які спачатку ківаў на знаёмага крымінальніка, але потым узяў віну на сябе. Пазней «прызнаецца» ў забойстве яшчэ адзін чала-

**Працяг на старонцы 4.**

# Купіце палац



Усяго за $5,9 млн.

Аўкцыён па продажы палацава-паркавага комплексу ў Свяцку Гродзенскага раёну, які знаходзіцца ў спісе помнікаў рэспубліканскага значэння, 9 снежня не адбыўся, бо не было пададзена заявак на ўдзел. Чарговы аўкцыён адбудзецца 19 снежня. Стартавая цана комплексу зніжаная на 20% і складае цяпер 13 млрд рублёў ($5,9 млн). Калі ў найбліжэйшыя таргі не знойдзецца ахвочых набыць шыкоўны палац Валовічаў за такі кошт, яго скароцяць яшчэ на 50%. У выпадку, калі прадаць палац не ўдасца, то яго лёс вырашыць уласнік — Гродзенскі райвыканкам. Адзін з магчымых варыянтаў, які разглядае ўласнік, — перадача палацу Нацбанку.

Палац у стылі барока збудаваў італьянскі архітэктар Джузэпэ Сака, які зьяўляецца аўтарам іншых будынкаў, створаных у суседняй Горадні ў часы апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

За палякамі тут была створаная наркалагічная лякарня, адзіная на той час у Польшчы. Да 2005 году тут месцілася сухотная лякарня. Апошнія тры гады палац пустуе і паступова разбураецца.

СП

## Хочаш «цыбуліну» на касцёле — знайдзі дакументы

Мінкультуры загадала падрыхтаваць навуковае абгрунтаванне і праектна–каштарысную дакументацыю для пераабсталявання былога касцёлу дамініканскага кляштару канца XVII ст.

На паседжанні Навукова-метадычнай рады ў пытаннях гістарычна-культурнай спадчыны пры Мінкульце клецкія чыноўнікі атрымалі вымовы за тое, што насуперак рэкамендацыям міністэрства дапусцілі ўсталяванне на даху былога касцёлу дамініканскага кляштару канца XVII ст. купала-цыбуліны. Настаяцелю клецкага праваслаўнага прыходу а. Мацею Белавусу, які ўсталяваў той купал, загадалі падрыхтаваць навуковае абгрунтаванне і неабходную праектна-каштарысную дакументацыю. «Фактычна гэта азначае спробу заднім чыслом узаконіць самавольныя змены ў аздабленні былога касцёлу», – мяркуе старшыня Добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч.

Сямён Печанко

## «Бабруйскі кур’ер» можа з’явіцца ў шапіках

Пасля таго як «НН» і «Народнай волі» было прапанавана вярнуцца ў дзяржаўную сістэму распаўсюду, рэдактар «Бабруйскага кур’еру» меў гутарку з начальнікам Дэпартаменту друкаваных СМІ Мініфармацыі. «З гутаркі я зрабіў выснову, што мы маем надзею аднавіць распаўсюд праз «Белсаюздрук» да канца снежня», — паведаміў галоўны рэдактар «БК» Анатоль Санаценка.

«Бабруйскі кур’ер» — незалежнае грамадска-палітычнае выданне, піша па-беларуску і парасійску. Два гады таму «Белсаюздрук» спыніў працу з выданнем. Але «Бабруйскі кур’ер» ёсць у падпісных каталогах «Белпошты». Прадаецца газета на поштах гораду і раёну, у Рэдакцыі, у прыватных распаўсюднікаў. Выходзіць «БК» у серады накладам 2000 асобнікаў.

СП

## След Снегіра

Працяг са старонкі 3.

век, які меў алібі — быў той дзень у іншай вёсцы. Г. Юбко дакументальна пацвердзіла тое алібі, і яго вызвалілі з пад варты. У скарзе ў пракуратуру ён звінаваціць следчых у катаваннях з мэтай прымусіць яго агаварыць сябе.

Справа Юбко прыпынялася і пачыналася паводле адкрытых новых абставінаў. Спн.Галіна атрымала ад праваахоўнікаў безліч адпісак. Адна з іх — пастанова аб прыпыненні крымінальнай справы — была падпісаная Міхаілам Снегірам, тады пракурорам Мінскай вобласці: «У той вечар, калі адбыўся пажар, падзеі ў в. Захараўка адбываліся вельмі хутка, вялікая колькасць людзей рухалася ў розных напрамках і прадпрымала розныя дзеянні на невялікай тэрыторыі у абмежаваны адрэзак часу». На думку Г. Юбко, такім чынам у абласной пракуратуры спрабавалі схаваць памылкі ніжэйшых інстанцый.

СП

## сцісла

### Выдаляюць чарговую групу ксяндзоў

Тром польскім рымска-каталіцкім святарам з Гродзенскай дыяцэзіі не падоўжаны дазвол на рэлігійную дзейнасць у Беларусі на 2009 год. Ксяндзам Яну Браноўскаму з вёскі Галынка Гродзенскага раёну, Яну Сканечнаму з мястэчка Поразава і Анджэю Краўчыку са Слоніму прадпісана завяршыць сваю дзейнасць у краіне да 1 студзеня. Матыў адмовы — «ксяндзы не валодаюць дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь».

### Адзін з лідэраў ПКБ прапануе змяніць назву партыі

Сакратар Гродзенскага абкаму Партыі камуністаў беларускай Павал Станеўскі зрабіў такую прапанову на старонках газеты «Товарищ». Станеўскі адзін з прадстаўнікоў малодшага пакалення ў ПКБ. Гэтая прапанова мае быць абмеркавана ў сакавіку на з’ездзе ПКБ.

### Саўмін на варце восьмага запавету

Для сельскагаспадарчых арганізацый і іншых структурных падраздзяленняў, якія выконваюць работы, звязаныя з вытворчасцю сельгаспрадукцыі, дызельнае паліва будзе пастаўляцца афарбаваным у зялёны колер, а аўтамабільны бензін «Нармаль-80» — у сіні.

Такое рашэнне мае дапамагчы ад крадзяжоў у калгасах.

### Гродна пад лёдам

Раніцай у Гродна пры тэмпературы паветра мінус 2 градусы прайшоў дождж. У выніку горад абледзянеў. Адбыліся дзесяткі аварый, не менш за паўсотні чалавек атрымалі траўмы на лёдзе.

МБ

## Андрэй Арамнаў

Найлепшы спартовец Беларусі 2008 году.



Алімпійскі чэмпіён Пекіну цяжкаатлет Андрэй Арамнаў прызнаны найлепшым спартоўцам Беларусі 2008 году. Ён перамог у юбілейным, 50-м па ліку апытанні газеты «Спортивная панорама».

У дзесятку найлепшых атлетаў увайшлі таксама кідальніца молата Аксана Мянькова, канаісты браты Аляксандр і Андрэй Багдановічы, дзесяціборац Андрэй Краўчанка, цяжкаатлет Андрэй Рыбакоў, мастацкая гімнастка Іна Жукава, штурхальніца ядра Наталля Міхневіч, весляры Вадзім Махнеў і Раман Петрушэнка, Кацярына Карстэн і раварыст Васіль Кірыенка.

З камандай сумневаў не было — барысаўскі БАТЭ. Другой стала жаночая зборная па баскетболе.

У апытанні ўдзельнічалі і 2 журналісты «НН». Цікава, што іхні выбар цалкам супаў з агульным.

ЗП




АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

Дырэктарка «Белсату» Агнешка Рамашэўская рэжа торт з нагоды першай гадавіны каналу.

# 200 000 пар вачэй

Кожны 50–ты беларус глядзіць «Белсат», падлічылі на тэлеканале.

10 снежня «Белсат» адсвяткаваў сваю першую гадавіну ў тэлеэфіры. Нарэшце з’явілася вартая даверу інфармацыя пра колькасць гледачоў тэлеканалу. На замову «Белсату» сацыялагічнае даследванне яго аўдыторыі правёў адзін з незалежных беларускіх інстытутаў, апытаўшы з дапамогай анкетаў 3000 асобаў. Аказалася, у Беларусі «Белсат» глядзяць каля 200 000 чалавек. З гэтага вынікае, што аўдыторыя «Белсату» па колькасці прыкладна роўная ці перавышае аўдыторыі такіх тэлеканалаў, як «РТР Планета», «Мір», «НТВ Мір», MTV (Расія), «8 канал», «БелмузТВ», «ТВЦ», «Першы музычны канал». «200 тысячаў гледачоў — гэта пазітыўная для нас інфармацыя, — заявіў Аляксей Дзікавіцкі, кіраўнік інфармацыйнай перадачы «Аб’ектыў», прэзентуючы вынікі. — Варта памятаць, што «Белсат» толькі на працягу чатырох месяцаў вяшчае таксама праз найпапулярнейшы ў Беларусі спадарожнік — Сірыус».

З тых, хто бачыў праграмы «Белсату», 68,4% яны, у цэлым, спадабаліся, і толькі 11,9% імі збольшага незадаволеныя. Найбольш гледачоў (64,5%) праглядаюць тэленавіны, 59% цікавяцца фільмамі, 47,7% аддаюць перавагу музычным перадачам, а 44,4% глядзяць найперш дакументальныя фільмы. У сярэднім глядач «Белсату» прысвячае тэлеканалу 2,3 гадзіны на тыдзень. У параўнанні з аўдыторыяй дзяржаўнага беларускага тэлебачання, аўдыторыя «Белсату» маладзейшая, мае вышэйшы адукацыйны ўзровень. Цікава, што сярод гледачоў «Белсату» значна больш мужчынаў, чым жанчынаў. Мабыць, у будучыні «мужчынскі» адсотак яшчэ больш падвысіцца: у дзень першых народзінаў тэлеканалу ў эфіры пачалі выходзіць і спартовыя навіны.

АК

**Працяг са старонкі 2.**

# І ботам не кінуў

Далей адбылася маленькая дыскусія пра эканамічныя санкцыі. Гэтыя ўколы шпількай, кажу, толькі раздражняюць. Не заўжды прасталінейная палітыка — найлепшая. Трэба спалучаць прынцыповасць і гнуткасць.

Тут Буш кінуў рэмарку: ну вось калі б усе краіны далучыліся, тады і эфект быў бы! Мая аргументацыя была такая: па-першае, гэта нерэальна, нават Вашынгтон і Брусель не могуць паразумецца ў беларускім пытанні, а па-другое, ёсць небяспека, што беларускаму кіраўніцтву не застанецца іншага шляху, як здавацца Расіі. Карацей, кропкі на «і» ў гэтым пытанні мы так і не расставілі.

Гаворка з Бушам, з прадстаўнікамі яго каманды пакінула ўражанне, што асаблівай стратэгіі ў беларускім пытанні Вашынгтон не мае. Ёсць агульная ўстаноўка: трымаць на цугундары, дамагацца дэмакратызацыі.

Адчуваецца скепсіс у дачыненні да той лініі, што абраў у стасунках з Мінскам Брусель. Маўляў, сядуць гэтыя еўрапейкія мудрыя печкуры ў галёш. Але пра каардынацыю ці моцную самастойную парадыгму дзеяннняў ЗША на беларускім кірунку казаць не выпадае.

Некаторыя палітолагі бачаць тут гульню ў добрага і злога следчага, аднак Вашынгтон, бадай, проста трымае паўзу.

Па-першае, гэтая адміністрацыя ўжо сядзіць на чамаданах.

Па-другое, Амерыка ад Беларусі далёка, гандаль з «апошняй дыктатурай» (гандаль у літаральным сэнсе) невялікі. Гэта на Варшаву, Вільню, Берлін цісне пытанні канкрэтных гешэфтаў. Дый геапалітычна Еўропа заклапочана значна болей. Яна хоча стварыць на ўсходнім кірунку падушку бяспекі, санітарны кардон — называйце як хочаце. Адгарадзіцца ад непрадказальнай Расіі паласой лаяльных да ЕС краін. Таму Брусель і выбары «стэрыльнай палаты» праглынуў, і сваё Усходняе Партнёрства рэкламуе. Штаты ж могуць дазволіць сабе з алімпійскім спакоем чакаць, пакуль «кліент саспее».

Трохі перасточу. Пасля гутаркі з Бушам адзін з не самых дробных чыноўнікаў Дзярждэпу, калі я спытаўся, ці ёсць у іх нейкая дарожная карта, ці можна канкрэтызаваць сённяшнія патрабаванні ЗША да кіраўніцтва Беларусі, — назваў сярод іншых і вяртанне Еўрапейскага гуманітарнага універсітэту ў Мінск.

Д'ябал хаваецца ў дэталях. А менавіта дэталі, нюансы беларускай сітуацыі, як я пераканаўся, з-за акіяну не заўсёды бачныя. Там не ведаюць, што вяртанне двух апальных друкаваных брэндаў у кіёскі ды паштовыя каталогі абярнулася натуральнай абдзіраладўкай: за распаўсюд «Белсаюздрук» лупіць 55% ад адпускной цаны. Ну і гэтак далей. Усю адлігу можна ахарактарызаваць фразай класіка: па форме правільна, а па сутнасці — здзек.

Хаця б фрагментарна я пастараўся, наколькі было магчыма, акрэсліць спецыфіку беларускай сітуацыі — і медыйнай, і ўвогуле — на сустрэчы ў гасцёўні Рузвельта. Амерыканскі ж прэзідэнт як дасведчаны мадэратар раз-пораз рэзка мяняў рэчышча гаворкі. А выказацца хацелі ўсе.

Мільганула непаліткарэктная асацыяцыя: некалі былі хадакі ў Леніна — а цяпер вось блогеры ў Буша. Гаспадар таксама імкнуўся выглядаць «самым чалавечным чалавекам»: жартаваў, падміргваў, падкрэсліваў, што ніякай дыстанцыі не мусіць быць. Пры канцы прапанаваў усім разам сфатаграфавацца. Па-сяброўску прыабняў людзей з «апошняй дыктатуры». Ну і ўсё, гуд лак!

Буш па-майстэрску ўклаўся ў гадзіну. Зразумела, шмат работы, трэба здаваць справы новаму прэзідэнту. Пра тое ж спакойна казалі і людзі з яго атачэння: сыходзім, саступаем месца новай камандзе. Ні для кога гэта не выглядала жыццёвай катастрофай.

Будзённая ратацыя эліт, невядомая сённяшняй Беларусі.

Каля Белага Дому — разгром, тырчаць нейкія металічныя каркасы. Робяць трыбуны для інаўгурацыі Абамы.

Вось жывуць жа людзі, дзвесце гадоў не ламаючы канстытуцыі. І няблага, далажу я вам, жывуць.

*Вашынгтон — Мінск*

# Кадры Абамы

**У Беларусі — вертыкаль. А як фармуецца каманда прэзідэнта самай багатай краіны ў свеце? Піша Віталь Тарас.**

Цяперашні эканамічны крызіс спарадзіў шмат жартаў — дакладная прыкмета таго, што людзі пачалі ставіцца да яго ўсур'ёз. Рэанімуюцца і анекдоты савецкай эпохі. Напрыклад, чалавек прыходзіць у паліклініку і запытваецца — як патрапіць да лекара вуха-вока? Яму тлумачаць, што такога няма, ёсць вуха-горла-нос. «Не, — упарціцца пацыент. — Мне патрэбны лекар вуха-вока. Бо ў тэлевізары чую адно, а ў жыцці бачу зусім іншае».

Сапраўды, калі БТ расказвае пра крызіс на Захадзе, кроў стыне ў жылах. Калі заходзіць размова пра сітуацыю ў айчыннай эканоміцы і сацыяльнай сферы, можна падумаць, што дзякуючы крызісу беларусам жыць стала яшчэ лепш, яшчэ весялей.

Крызіс у нас насамрэч выглядае дзіўнавата. У Мінску, вядома, не праводзяць, як у Маскве, выставаў для мільянераў, дзе прадаюцца яхты і аўтамабільныя шыны з дыяментавымі стразамі. Але ў нашых аўтааматараў уласная годнасць — цэны на бензін упершыню за доўгі час знізіліся на 10%. Тое, што для РФ падзенне цэнаў на нафту ледзьве не нацыянальная трагедыя (як той казаў, працэс уставання Расіі з каленяў спыняецца пры цане барэля ніжэй за 50 даляраў), для беларускага спажыўца — у радасць. Ці надоўга?

Галоўнае пытанне — якая перспектыва чакае Беларусь, стан эканомікі якой залежыць ад рээкспарту энерганосьбітаў. А ён падае. Як няўхільна падае і курс рубля. Хочаш не хочаш, трэба прыстасоўвацца да новай сітуацыі, разнявольваць рынак, адмаўляцца ад каманднa-адміністрацыйных метадаў, арыентавацца на Захад, на Еўрасаюз. Гэта і ў найвышэйшым кіраўніцтве, здаецца, зразумелі.

Але дзяржаўны прапагандысцкі апарат, створаны для абслугоўвання ўладнай вертыкалі, не прыстасаваны да новых задач. Прапаганда працягвае ілгаць пра агульны стан рэчаў альбо замоўчвае яго.

Гэта асабліва выразна відаць на прыкладзе нашага суседа, дзе СМІ займаюцца спекуляцыямі на тэму падступнай палітыкі амерыканскага імперыялізму. Пуцін, які скрозь зубы прызнаў, што крызіс прыйшоў і ў Расію, адразу ж паказаў пальцам на вінаватых — на ЗША. І што з таго, што каціроўкі на расійскіх фондавых біржах наўпрост залежаць ад біржавых паказчыкаў у Злучаных Штатах? Што ўсе надзеі на выхад расійскай эканомікі з крызісу звязаныя з надзеяй на будучы пад'ём амерыканскай эканомікі? Галоўнае — каналізаваць незадаволенасць насельніцтва ў патрэбнае рэчышча.

### У чым розніца?

Прапаганда як у Расіі, гэтак і ў Беларусі, застаецца ў палоне стэрэатыпаў. Яна не здольная прыдумаць нешта новае. Адбываецца крызіс жанру.

Паглядзіце на славутую амерыканскую дэмакратыю, кажуць нам дамарослыя палітолагі, там жа няма ніякага выбару! У рэспубліканцаў быў прэзідэнт Джордж Буш, потым прэзідэнтам стаў Джордж Буш-малодшы. Быў прэзідэнт Клінтан, цяпер новая каманда дэмакратаў на чале з новаабраным прэзідэнтам Абамам фармуецца з тых самых людзей, што працавалі пры Клінтану. А ягоная жонка Хілары становіцца на чале Дзярждэпартаменту. Хіба гэта не той самы інстытут пераемніцтва? І там адміністрацыя паўсюль расстаўляе сваіх людзей. І там пасады прадаюцца. У Расіі існуе нават негалосны тарыф на дэпутацкія крэслы...

Вось і губернатар штату Ілінойс Благоевіч спрабаваў «таргануць» крэслам сенатара, якое займаў Абама. Цяпер аднапартыйцу новаабранага прэзідэнта пагражае 10 гадоў турмы.

А тое, што будучая адміністрацыя дэмакратаў фармуецца галоўным чынам з людзей Клінтана — абсалютна натуральна. Бо Абама пачынае не на голым месцы, ён абапіраецца на досвед сваіх папярэднікаў-аднапартыйцаў. Але гэта не перашкодзіла яму пакінуць міністрам абароны ЗША ў сваёй адміністрацыі цяперашняга міністра, рэспубліканца Роберта Гейтса. Але гэта ўсё дэталі. Галоўнае адрозненне ад механізму ўлады ў Беларусі ці Расіі ў тым, што Абаму давялося перамагаць свайго суперніка Маккейна ў рэальнай, а не закуліснай барацьбе. У выбарчай кампаніі прэтэндэнты асабіста змагаліся за голас кожнага выбаршчыка ў кожным штаце. Бясконцыя паездкі па краіне, тысячы сустрэч з людзьмі, выступы на мітынгах, публічныя дэбаты, часам жорсткія, на грані фолу. І ніхто да апошняга дня не мог упэўнена прадказаць вынікі выбарчай гонкі.

Усе найважнейшыя пытанні жыцця амерыканцаў — ад крызісу да прысутнасці войскаў у Іраку — абмяркоўваліся публічна, на вачах у мільёнаў выбаршчыкаў.

Абранне прэзідэнтам ЗША афраамерыканца стала першым у гісторыі. І яшчэ многае пры ім будзе ўпершыню. У фармаванні адміністрацыі новаабраны прэзідэнт пабіў рэкорд Джорджа Буша-старэйшага. Той назваў імёны будучых міністраў на ключавых пасадах праз 39 дзён пасля свайго абрання, Абама зрабіў гэта на 28 дзень. Абставіны вымушаюць. У першую чаргу намінаваныя на пасады тыя, хто будзе адказваць за эканамічную палітыку, за выхад з крызісу. Міністрам фінансаў стаў Цімаці Гайтнэр, цяперашні кіраўнік Федэральнага рэзервовага банку Нью-Йорку. Пра аўтарытэт Гайтнэра ў колах прадпрымальнікаў гаворыць той факт, што яго намінаванне на будучую пасаду выклікала рост каціровак на фондавых рынках ЗША. Дырэктарам у справах нацыянальнай эканомікі будзе Лоўрэнс Самэрс, які быў міністрам фінансаў пры Клінтане, а галоўным дарадцам Абамы ў эканамічных пытаннях стане Пол Уолкер, што ўзначальваў Федэральную рэзервовую сістэму ЗША пры Джымі Картэры. Ва ўсіх трох багаты досвед барацьбы з банкаўскімі і фінансавымі крызісамі ў мінулым. Гіганцкія праблемы, якія паўсталі перад краінай, не хаваюцца. Над іх вырашэннем у Вашынгтоне працуюць ужо сёння, разам з... рэспубліканскай адміністрацыяй. Хоць, здавалася б, менавіта на Буша і яго каманду лягчэй за ўсё зваліць адказнасць за крызіс.

### Каманда мары

Прызначэнне на пасаду дзяржсакратара Хілары Клінтан палітолагі лічаць моцным палітычным крокам, скіраваным на аб'яднанне дэмакратаў.

Пасада першага намесніка дзяржсакратара, як мяркуецца, дастанецца палітолагу Марку Бжазінскаму, сыну сусветна вядомага геапалітыка Збігнева Бжазінскага. Дарэчы, ён быў ужо ў Мінску і наведаў Курапаты.

Апытанні грамадскай думкі паказваюць, што фармаванне каманды Абамы, як яе называюць — Dream Team выклікаюць ухвалу 79% амерыканцаў.

Ужо намінаваныя на свае пасты міністр энергетыкі ЗША Стывен Чу — лаўрэат Нобелеўскай прэміі ў галіне фізікі, прафесар універсітэта ў Берклі, міністр юстыцыі Эрык Холдэр, міністр унутранай бяспекі Джанэт Напалітана, (губернатарка штату Арызона), прадстаўніца ЗША ў ААН С'юзэн Райс (не сваячка Кандалізы), дарадца ў справах нацыянальнай бяспекі адмірал Джэймс Джонс, кіраўнік дэпартаменту ў справах ветэранаў генерал у адстаўцы Эрык Шынсэкі.

Цікава, што прызначэнне Шынсэкі, які мае японскія карані, адбылося акурат у чарговую гадавіну нападу Японіі на амерыканскую базу Пёрл-Харбар 7 снежня 1941 г. Сярод названых міністраў — кітаец Чу, афраамерыканцы Холдэр і Райс. Калі пасаду спецпрадстаўніка прэзідэнта на Блізкім Усходзе ўзначаліць былы дзяржсакратар Колін Паўэл, іх будзе на вышэйшых пасадах, прынамсі, трое. Вялікая роля адводзіцца жанчынам: Клінтан, Напалітана, Райс... Да таго ж, Нэнсі Сатлі, якая ўзначаліць Раду па стане навакольнага асяроддзя, будзе першай адкрытай прадстаўніцай сексуальных меншасцяў у адміністрацыі ЗША.

Апарат Белага Дому ўзначаліць Рам Эмануэль, які спавядае артадаксальны юдаізм. Гэта ўжо выклікала крытыку Абамы ў мусульманскіх краінах.

Паліткарэктнасць, г.зн. падкрэсленая павага да ўсіх нацый, расаў, рэлігій, заўсёды была канькам амерыканскіх дэмакратаў. Можна па-рознаму да гэтага ставіцца, можна іранізаваць. Але ж паліткарэктнасць, сярод іншага, зрабіла магчымай перамогу афраамерыканца на выбарах у ЗША. Акрамя таго, адна справа гаварыць пра правы жанчын і вылучаць для іх квоту на апературных, палатачных выбарах, і зусім іншая — даваць жанчынам рэальную магчымасць праявіць свае здольнасці на самых адказных пасадах. Дэмакратыя ёсць дэмакратыя.

# «Верым толькі прэзідэнту»

**Каля 3000 чалавек сабралася ў сталіцы на акцыю індывідуальных прадпрымальнікаў.**

Прыкмета апошніх гадоў: зіма ў Беларусь прыходзіць разам з пратэстамі прадпрымальнікаў. Нейкая адвечная песня — штораз перад Новым годам прадпрымальнікі сутыкаюцца з новымі ўмовамі працы. Па ўсёй краіне праходзяць акцыі пратэсту. Улады ідуць на невялікія саступкі. Пасля ўсё пачынаецца наноў.

За год ужо ўсе паспелі звыкнуцца з указам Лукашэнкі № 760, які забараняе дробным гандлярам мець наёмных рабочых. Тым самым указам, які ў студзені выклікаў бурлівыя пратэсты і скончыўся крымінальнай «Справай 14-ці» супраць маладых актывістаў. За год гандляры прыстасавалі бізнес да ўказу-760. Не ён быў прычынай новых пратэстаў. Найбольшую незадаволенасць цяпер выклікаюць новыя падаткі на тавары з Расіі.

Акцыя 15 снежня таксама агаліла і канфлікт інтарэсаў у прадпрымальніцкім руху. Аб'яднанне «Перспектыва» Анатоля Шумчанкі, якая ладзіла шэсце, зацікаўленае ў вырашэнні выключна сацыяльных праблемаў прадпрымальнікаў. Іншыя лідэры — Алесь Таўстыка, Віктар Гарбачоў, Аляксандр Макаеў — лічаць, што сацыяльныя пытанні можна вырашаць толькі з палітычнымі.

«Я цябе па-харошаму прашу, апусці», — казаў Шумчанка Таўстыку, калі той ля Акадэміі навук узняў сцяг Руху за Свабоду. Той самы Шумчанка, мабыць, памятаючы пра «Справу 14-ці», загадзя папрасіў не прыходзіць на акцыю апазіцыю. А дэмакратычныя актывісты ўзялі ды паслухаліся.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Шумчанка лічыць, што трэба ставіць толькі эканамічныя патрабаванні. Макаеў (злева) — і эканамічныя, і палітычныя.**

Таўстыка прасіў слова, каб сказаць, што ісці заяўленым маршрутам на плошчу Бангалор ганебна, а адстойваць свае правы трэба ля Адміністрацыі прэзідэнта. Але яго адпіхвалі ад мегафона. Шумчанка парыраваў народнай мудрасцю: не месца красіць чалавека, а чалавек — месца. І калона з трох тысяч чалавек рушыла красіць сабой Парк дружбы народаў.

Ішлі мірна, паслухмяна пераходзячы дарогу на зялёнае святло. Група аховы сачыла нават за тым, каб ніхто не выходзіў на газон. У руках мелі маленькія сцяжкі з надпісам «Предприниматель Беларуси». Час ад часу калона дружна пачынала імі махаць. Нібы на Дзень Рэспублікі.

Неслі расцяжку з цытатай самога Шумчанкі: «У цяжкія часы для дзяржавы прадпрымальнікі былі і будуць надзейнай апорай для народу». Не абышлося і без рэверансаў . «У Беларусі застаўся толькі адзін чалавек, якому могуць верыць прадпрымальнікі, — гэта прэзідэнт» , — заявіў А.Шумчанка ў інтэрв'ю.

Мітынг на Бангалоры доўжыўся паўгадзіны. Прынялі рэзалюцыю, якая заклікае ўлады зняць абмежаванні на ўвоз тавараў з Расіі, даць магчымасць наймаць на працу да пяці чалавек, стварыць пры Адміністрацыі камісію, якая б займалася справамі прадпрымальнікаў.

Потым да мікрафону, пад выгукі Шумчанкі, што акцыя скончылася, прарваўся Аляксандр Макаеў. Ён прызначыў наступны збор прадпрымальнікаў — 12 студзеня. І гэтым разам ужо на Кастрычніцкай плошчы.

**Зміцер Панкавец**

# Мілінкевіч: Еўропа расчараваная дзеяннямі апазіцыі

Такую думку выказаў лідэр незарэгістраванага «Руху «За Свабоду» падчас сустрэчы з жыхарамі Гомелю 14 снежня. Ён заявіў, што будзе браць удзел у прэзідэнцкіх выбарах 2011 году.

Еўропе неабыякавы лёс Беларусі і яе суверэнітэт, лічыць Аляксандр Мілінкевіч. Такую думку ён выказаў падчас сустрэчы з жыхарамі Гомелю, якая прайшла 14 снежня. У ёй узялі ўдзел больш як 60 чалавек.

«Заходнім краінам не патрэбныя якія-небудзь змяненні межаў, калапс беларускай эканомікі. Калапс нашай эканомікі — гэта хваля эміграцыі да іх», — лічыць палітык.

Лідэр руху таксама зазначыў, што «Еўропа расчараваная дзеяннямі апазіцыі».

Актывістам апазіцыі А.Мілінкевіч нагадаў аб неабходнасці працаваць з людзьмі, даводзіць да іх інфармацыю аб магчымасцях супрацоўніцтва з Еўрасаюзам, аб дэмакратычных інстытутах.

Прысутныя пыталіся аб уплыве сусветнага фінансавага крызісу на эканоміку краіны, аб унутрыпартыйнай барацьбе лідэраў апазіцыі, аб эфектыўнасці збору подпісаў за змяненне Выбарчага кодэкса, выкарыстанні сучасных PR-тэхналогій апазіцыяй і інш.

На пытанне аб тым, ці плануе А.Мілінкевіч вылучаць сваю кандыдатуру на прэзідэнцкія выбары 2011 году, лідэр руху адказаў сцвярджальна.

**БелаПАН**

## Дамавік шпаркі, АТС павольная

Безлімітны інтэрнэт робіцца ўсё больш папулярным у беларусаў. Аж не стае АТС, каб задаволіць попыт на падключэнне да сеціва. Частка наяўных АТС састарэла маральна. Часовае прыпыненне падлучэнняў да безлімітнага інтэрнэту плодзіць чуткі. Так, з'яўленне на сайце правайдэра «Шпаркі дамавік» падобнага паведамлення справакавала размовы пра «руку» айчыннага манапаліста «Белтэлекаму», які нібыта забараняе правайдэрам папаўняць спіс кліентаў.

**СП**



## Жанна Літвіна атрымала прэмію Фонду Эберта

**Уручэнне прайшло 12 снежня ў Берліне. Адзначалася, што прэмія — не толькі прызнанне заслуг старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў у змаганні за свабоду слова, але і знак увагі Еўропы да праблем беларускіх СМІ.**

**baj.by**

Штодзень некалькі брыгадаў даішнікаў, узброеных эвакуатарамі, апрацоўваюць цэлыя раёны Мінску. Дзяржаўтаінспекцыя сталіцаў працягвае акцыю «Аперацыя — Эвакуацыя!».

Кожны дзень на штрафстаянкі вывозіцца па 100—200 аўтамабіляў. У фокусе ўвагі ахоўнікаў парадку — не толькі цэнтр. Адказнасць за парушэнне правілаў прыпынку і стаянкі прадугледжвае штраф памерам у палову базавай велічыні (17 500 руб.) + кошт эвакуацыі транспартнага сродку — 11 тыс. рублёў. Да сумы можа дадацца кошт захоўвання машыны на штрафстаянцы. Ды яшчэ і марокі.

Праблемай Мінску застаецца абмежаваная колькасць парковачных месцаў. Асабліва праблемнымі застаюцца спальныя раёны, збудаваныя ў 1970—80-я, стаянкі якіх не разлічаныя на цяперашнюю аўтаўзброенасць насельніцтва.

**МБ**

## Масавая эвакуацыя ў сталіцы


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Беларускамоўная салідарнасць

**Калі ты гаворыш па-беларуску, гэта дапамагае ў большасці дзяржаўных і недзяржаўных установаў. Піша Руслан Равяка.**

На ТВ транслююць новае шоў. Нявесты ўдзельнічаюць у розных выпрабаваннях (забегах, вікторынах, конкурсах). Найлепшая атрымае добры пасаг. Глядзіць мая жонка... Яна і паклікала мяне. Хадзі сюды, цікавае пакажу. Адна маладуха адказвала на ўсе пытанні строгай камісіі толькі па-беларуску. У наступную нядзелю жонка радасна паведаміла, што наша знаёмая заняла высокае месца. І размаўляла, «як ты, на тваёй неправільнай, няшкольнай мове. І мужык яе такі самы, з тваіх знаёмых...»

Жонка дасюль верыць, што ўсе беларускамоўныя ведаюць адзін аднаго. Да шлюбу пацягаў я яе крыху па нашых вечарынах... Жонка, як і шмат хто, мяркуе, што беларускамоўных некалькі тысяч, і яны ўсе ведаюць адзін аднаго і дапамагаюць пры магчымасці. І галасуюць адзін за аднаго.

Але справы не ў думках маёй жонкі. Справа ў той салідарнасці, якую далёкія ад беларушчыны беларусы ўяўляюць сабе. Што б ні казалі, а шараговы беларус не верыць у неаплатнасць нашага існавання. Маўляў нешта вам плацяць... Калі не ўрад Злучаных Штатаў, дык хаця б беларускія эмігранты, з якімі ўсе беларускамоўныя абавязкова ж знаюцца. А тыя за акіянам спрэс заможныя і дзве траціны прыбытку выдаткоўваюць на беларускія справы... Так думае беларус.

Далёкія ад палітыкі людзі не вераць у раздрай між нацыяналістамі. Як жа, у іх жа ва ўсіх ёсць пункт яднання — мова.

І сапраўды, мова!

Знаёмыя беларускамоўныя распавядаюць, як мова дапамагае ў большасці дзяржаўных установаў. Адны чыноўнікі маюць затоеную сімпатыю да мовы. Не толькі яны — большасць людзей у Беларусі маюць да яе сімпатыю, нават калі самі не гавораць.

Другія вельмі ж баяцца скаргаў, а беларускамоўны — гэта патэнцыйны скаргападаўца. Таму лепей пытанне адразу вырашыць, чым пасля адпісвацца.



Сакратарка БРСМ універсітэту, пачуўшы родную мову, таксама пераключылася на яе. Цягам колькіх хвілінаў пытанне з інтэрнатам было вырашана.

Паказальная гісторыя аднаго беларускамоўнага прадпрымальніка з нашых Баранавіч. Яго дачка не здолела атрымаць інтэрнату ў ВНУ. Маці стамілася абіваць парогі розных інстанцый. Беларускамоўны бацька звярнуўся ў апошнюю інстанцыю — да сакратаркі БРСМ навучальнай установы. Якое ж дзіва было, калі сакратарка патрыётаў, пачуўшы родную мову, таксама пераключылася на яе. Цягам колькіх хвілінаў пытанне з інтэрнатам было вырашана. Найбольш падзівілася жонка, а пасля знайшла гэтаму лагічнае тлумачэнне — вы ж беларускамоўныя адзін аднаго ведаеце і дапамагаеце.

**Баранавічы**

# Як ратаваць помнікі

**Варта пазбягаць дэмагогіі наконт персанальнай адказнасці ўсіх чыноўнікаў і «рэжыму» ў цэлым за лёс кожнага асобнага помніка. Піша Алесь Белы.**

Мне падабаецца прыклад грамадскага аб’яднання «Прылуцкая Спадчына» і Інстытуту ёродкаў абароны раслін, які месьціцца ў былым палацы графаў Чапскіх у Прылуках. Там створаны мемарыяльны куток, фактычна — грамадскі музэй гісторыі былых уладальнікаў сядзібы. Сціплы, але годны. У ім па ўсім бачны рэальны клопат уладальніка — навуковай установы, пра захаванасць свайго Дому, пра гарманічнае спалучэнне эканамічных патрэбаў і культурнай традыцыі.

Сядзіба ў Камарове, пад Нарачу, служыць палігонам малога прадпрымальніцтва для навакольных вёсак. Колькі такіх прыкладаў па ўсёй краіне?

У апошнія гады навіны пра знішчэнне або барбарскую «рэканструкцыю» чарговага помніка архітэктуры ў Беларусі зрабіліся настолькі частымі, што стварылі ўжо эфект прызвычайвання. Але журналістам і грамадскім актывістам трэба не проста «біць у набат» пры кожнай магчымасці, але і папулярызоўваць станоўчыя прыклады захавання помнікаў культуры.



У кожным будынку музей або кавярню не ўтрымаеш.

Трэба ўваходзіць у кантакт з уласнікам аб’екту, якому пагражае небяспека. Высвятліць, якімі рэсурсамі для захавання, рамонту або рэстаўрацыі дыспануе ўласнік? Магчыма, ён хоць бы згодны прадаць стары будынак «на вываз»?

Па-другое, старацца рэалістычна ўявіць сабе магчымасці выкарыстання будынку пасля рамонту і рэканструкцыі. Немагчыма ўтрымліваць музей або кавярню ў кожным будынку, асабліва ў сельскай мясцовасці з яе надзвычай разрэджаным і малазабяспечаным насельніцтвам.

Па-трэцяе, хоць бы прыкладна ўяўляць сабе маштаб выдаткаў як на рэканструкцыю (капітальны рамонт) будынка, так і чыста эксплуатацыйных, рэгулярных выдаткаў.

Аддаваць прыярытэт публікацыям у мясцовай прэсе, а таксама нефармальнай камунікацыі з уладамі і мясцовымі актывістамі, ад якіх можа залежаць утварэнне грамадскай думкі. Пазбягаць дэмагогіі наконт персанальнай адказнасці ўсіх чыноўнікаў, пачынаючы ад прэзідэнта, і «рэжыму» ў цэлым, за лёс кожнага асобнага помніка.

Самае галоўнае: не нашкодзіць!

Чым больш рэалістычнай будзе пазіцыя ўсіх актывістаў кампаніі за ўратаванне, журналістаў, шараговых сімпатыкаў, тым болей аб’ектаў удасца ўратаваць. Але трэба здаваць сабе справу, што татальную неадукаванасць, незацікаўленасць, непрафесіяналізм немагчыма пераадолець імгненна і страты непазбежныя. Пакуль не ўтворыцца пласт прыватных уласнікаў, а таксама мясцовыя супольнасці, зацікаўленыя не проста ў захаванні, але ў канкрэтным, прадуманым выкарыстанні гістарычных будынкаў у гармоніі з уласнымі эканамічнымі і культурнымі інтарэсамі, ніякія дзяржаўныя чыноўнікі і законы, якімі б строгімі і сумленнымі яны ні былі, не здолеюць пераламаць сумную тэндэнцыю.

ВОДГУК

# Сілуэт Верхняга Гораду пад пагрозай

Апошнім часам «НН» пачала друкаваць ілюстрацыі да архітэктурных праектаў, якія могуць унесці вялікія змены ў аблічча Мінску. Такія публікацыі вельмі карысныя, бо праекты гэтыя не выстаўляюць на адкрыты паказ і не праводзіцца іх грамадскае абмеркаванне. Вось і ў «НН» №39’2008 быў надрукаваны багата ілюстраваны допіс на гэтую тэму пад назовам «Мінск праз дзесяць гадоў». «НН» дагэтуль звычайна займала паслядоўную пазіцыю абаронцы гісторыка-культурных каштоўнасцяў, але тэкст згаданага допісу гэтай традыцыі супярэчыць. Яго сутнасць — гэта спробы абгрунтавання нахабнага будаўніцтва велічэзнага гмаху гатэлю «Кемпінскі» на самай мяжы з гістарычнай забудовай Верхняга гораду. Аўтар тэксту карыстаецца цалкам надуманымі аргументамі, разлічанымі на наіўных і недасведчаных людзей. Мне ўжо даводзілася пісаць аб вялікай шкодзе, якую прынясе з’яўленне гатэлю такой вышыні на гэтым месцы (гл. «НН» № 40’2007 — «Цыліндры ў модзе» і № 20’2008 — «Верхняму Гораду пагражае спрэчка сілуэтаў»), але сцверджанні спадара ЛК вымушаюць мяне ізноў вярнуцца да гэтай тэмы.

На самай жа справе ніякай праблемы «вертыкальнага вектару» не існуе. Праблемы ўзнікаюць, калі на гэтае месца намагаюцца ўціснуць нешта яўна не адпаведнае. Якім «завяршэннем ансамблю» трэба займацца, калі ніводнаму з менчукоў і гасцей сталіцы не прыйдзе да галавы, што на гэтым месцы не хапае велізарнага збудавання, калі ён асабіста не зацікаўлены ў яго праектаванні ці будаўніцтве?

Кастрычніцкая плошча ўжо склалася як каштоўны архітэктурны ансамбль, характэрны для часу яго стварэння. Ён гарманічны па сваёй аб’ёмнай кампазіцыі і створаны з блізкіх у стылі будынкаў. Ён вельмі ўдала спалучаецца з суседняй забудовай 1930—1950-х. Цяпер жа плануюць не завершыць ансамбль, а, наадварот, парушыць яго — знесці адзін з яго складнікаў — будынак Музею Вялікай Айчыннай вайны, які фарміруе фронт забудовы і мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці (архітэктары Г.Бенедыктаў і Г.Заборскі). Нават калі музей пабудуюць на новым месцы, цяперашні будынак неабходна захаваць як помнік архітэктуры і частку ансамблю. Невялічкі кавалак незабудаванай тэрыторыі паміж ім і вуліцай Інтэрнацыянальнай патрабуе запаўнення аб’ёмам сціплым і ў памерах, і ў абліччы.

У свеце панабудавана столькі ўсяго рознага, што асобнымі прыкладамі можна абгрунтоўваць хоць якія праектныя рашэнні, нават і самыя барбарскія. Што можна і чаго нельга рабіць у Мінску? Усё залежыць ад нашых памкненняў, ад таго, што мы лічым каштоўным, што шануем, да чаго імкнемся. І гэта датычыць не толькі архітэктараў, а і ўсёй культурнай эліты грамадства. Наіўна было б думаць, што іншаземныя інвестары і нанятыя імі архітэктары будуць усур’ёз клапаціцца аб тактоўнасці сваіх прапановаў у адносінах да нашай спадчыны, аб гарманічным іх спалучэнні з наяўнай і будучай забудовай.



Тое, што яны прапануюць — творы халоднага розуму, абыякавага да мінскай даўніны. Тэкст спадара ЛК напісаны так, быццам гістарычнага Верхняга Гораду ў Мінску не існуе наагул. Аўтар замоўчвае галоўнае — як гатэль такой вышыні і на гэтым месцы паўплывае на ўспрыманне гістарычнай забудовы, на сілуэт Верхняга Гораду. А ўплыў гэты будзе катастрафічна адмоўным. Гэта будзе вялікая горадабудаўнічая памылка. Недарэчным будзе з’яўленьне гэтага хмарачосіка ў панараме гістарычнага Мінску. А ён з’явіцца, бо яго будаўніцтву няма адчувальнага грамадскага супраціву.

**Ігар Байцоў**

# Абвал

**Спад прамысловай вытворчасці ў лістападзе ў параўнанні з кастрычнікам склаў 13,8%.**

У многіх галінах прамысловасці Беларусі ў лістападзе ў параўнанні з кастрычнікам назіралася зніжэнне аб'ёмаў выпуску прадукцыі, паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт.

У цэлым спад вытворчасці ў лістападзе ў параўнанні з кастрычнікам склаў 13,8%.

Падзенне адбылося ў машынабудаванні і металаапрацоўцы — на 20,6%, у лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці — на 11,5%, у прамысловасці будаўнічых матэрыялаў — на 9,8%, лёгкай прамысловасці — на 9,5%, хімічнай і нафтахімічнай — на 9,3%, у харчовай прамысловасці — на 5,8%.

У паліўнай прамысловасці аб'ём вытворчасці застаўся на ўзроўні кастрычніка, у чорнай металургіі павялічыўся на 5,5%, у электраэнергетыцы — на 14%.

Паводле прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2008 год аб'ём прамысловай прадукцыі павінен узрасці на 11%. Хоць вынікі студзеня-лістапада проці студзеня-лістапада мінулага году яшчэ паказваюць рост за кошт буму першых месяцаў, ужо ясна, што на заплянаваны ўзровень без махінацый са статыстыкай не выйсці.

Прагнозы самыя песімістычныя: эксперты кажуць пра магчымы далейшы спад на 10% цягам апошняга месяца году. Такога спаду Беларусь не ведала ад пачатку 1999 году — тады адбіліся наступствы расійскага дэфолту 1998 году. Што да прамысловай вытворчасці, то такога рэзкага скарачэння за адзін месяц не фіксавалася ані ў 1999-м, ані ў самыя цяжкія месяцы эканамічнага крызісу ў 1992—1994 гадах. Апошні раз прамвытворчасць падала гэтак рэзка ў часе вайны.

Між тым у Расіі сапраўдны крызіс пачнецца толькі з пачатку наступнага году, асабліва цяжкай будзе першая палова, мяркуюць эксперты. Рэцэсія закране ўсе галіны эканомікі. А Беларусь застаецца прывязанай да расійскіх рынкаў збыту, таму непазбежна пацерпіць ад іх падзення.

**Мікола Бугай**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Вось дзе яны хаваюцца. Камерцыйныя кіёскі, якія таямніча пазнікалі з менскіх прыпынкаў, звезеныя на вуліцу Радыяльную. На думку гарвыканкаму, яны псавалі від гораду.**

## МВФ паставіў умову дэвальвацыі 10%

Ад 15 снежня ў Мінску пасля перапынку аднавіла працу місія Міжнароднага валютнага фонду ў справе выдзялення Беларусі стабілізацыйнага крэдыту памерам 2 мільярды даляраў. Чакаецца, што місія пад кіраўніцтвам сталага прадстаўніка МВФ у Расіі Нэвэна Мацеса працягне працу да пятніцы.

Старшыня Асацыяцыі беларускіх банкаў (АББ) Фелікс Чарняўскі заявіў, што ўрад выконвае ўмовы МВФ для атрымання крэдыту $2 млрд. З ягоных словаў, па многіх пазіцыях кансенсус з МВФ дасягнуты. Умовы дэвальвацыі, якія нам выставілі, не 20%, а 10%. 5% дэвальвацыі мы ўжо маем, цвердзіць старшыня АББ. Яшчэ адной умовай было скарачэнне заробкаў. З гэтым заданнем урад таксама справіўся — з 1 снежня тарыфную стаўку 1 разраду скарацілі з 91 тыс. рублёў да 77 тыс. рублёў (на 15,4%).

Чаму такія патрабаванні? Бо ў часы крызісу крэдыты не праядаюць, — вучыць МВФ.

**СП, паводле bsb.by**

## Рубель трашчыць і гнецца

Попыт па замежныя валюты на Беларускай валютна-фондавай біржы па-ранейшаму перавышае прапанову. За адну сераду Нацбанк мусіў прадаць $55 млн, 10 млн эўра і 112 млн расійскіх рублёў, каб кампенсаваць дэфіцыт і ўтрымаць курс гэтых валютаў.

Паводле вынікаў гандлю на Беларускай валютна-фондавай біржы курс даляра не змяніўся, еўра і расійскі рубель падраслі да 3107 і 79,9 рублёў за адзінку адпаведна.

Нягледзячы на інтэрвенцыі Нацбанку, біржавы курс даляра дасягнуў верхняй прагнознай мяжы за год — 2200 рублёў.

Пры такіх тэмпах уцёкаў ад рубля золатавалютныя запасы Беларусі могуць скараціцца за снежань нават больш чым на мільярд даляраў. Валютныя паступленні прадпрыемстваў рэзка знізіліся, між тым расходы застаюцца на ранейшым узроўні.

Атрыманне крэдыту ад Міжнароднага валютнага фонду робіцца ў такіх умовах крытычна неабходным для фінансавання імпарту.

**Мікола Бугай**

## Беларусбанк спыніў крэдытаванне набыцця жылля

Найбуйнейшы беларускі банк ААТ АСБ Беларусбанк 8 снежня спыніў крэдытаванне пакупкі жылля, паведамілі ў банку. Беларусбанк цяпер ажыццяўляе толькі крэдытаванне будаўніцтва жылля — пад 15% і 20% гадавых. Таксама Беларусбанк паведамляе пра зніжэнне працэнтнай стаўкі на 5 працэнтных пунктаў пры датэрміновым пагашэнні крэдытаў. Зроблена гэта, каб людзі хутчэй вярталі крэдыты.

Абмежавалі выдачу крэдытаў і іншыя банкі Беларусі. Дэльтабанк наогул прыпыніў яе. Беларускі Народны Банк выдае крэдыты толькі на спажывецкія патрэбы ў далярах тэрмінам на 3 гады ажно пад 22% гадавых. Белінвестбанк мае чаргу на разгляд заявак 2—3 тыдні. Белзнешэканамбанк выдае крэдытныя карткі на 3 гады ў беларускіх рублях пад 24%, у валюце пад 23% з даведкай пра даходы. А Прыёрбанк паведамляе, што спажывецкія крэдыты гатоўкай і на картку выдаюцца толькі ў валюце пад 15% да 2500 даляраў ЗША, у беларускіх рублях — выдаецца беззаўны крэдыт на аплату тавараў у гандлёвых кропках пад 18%, зазначае infobank.by.

**СП; паводле infobank.by**

## Крызіс і пінскі трыкатаж

Да апошняга часу шмат хто з пінчукоў зарабляў тым, што набываў на мясцовым трыкатажным рынку вопратку гуртам ды вёз у Расію. Сёння тыя гандляры вяртаюцца назад з поўнымі валізамі. Часцей за ўсё гандляры возяць свой тавар у вялікія прамысловыя гарады, прадаюць яго на прадпрыемствах. Але цяпер там настаці няпростыя часы — затрымліваюць ды скарачаюць заробкі, звальняюць людзей. Не да трыкатажу. Вось так сусветны фінансавы крызіс адгукнуўся ў Пінску.

**Ул. інф.**

# Такога спаду Расія не ведала з 1942 году

**Вытворчасць прамысловай прадукцыі ў Расіі ў лістападзе 2008 году ўпала ў выніку фінансавага крызісу на 8,7% у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага году.**

Нізкі рост расійскай эканомікі ў кастрычніку (каля 0,6%) папсаваў гадавыя паказчыкі — рост у студзені—кастрычніку склаў каля 4,9%. Прагнозы самыя песімістычныя: эксперты кажуць пра магчымы далейшы спад на 10% цягам апошняга месяца году. Такога спаду Расія не ведала ад пачатку 1999 году — тады адбіліся наступствы дэфолту 1998 году.

Вытворчасць скарачаецца ў апрацоўчай прамысловасці, вытворчасці і размеркаванні энергіі, газа і вады, здабычы карысных выкапняў.

Паралельна са спадам вытворчасці ў Расіі ад верасня фіксуецца сталае падзенне цэнаў у прамысловасці — на 5%, 6,6 і 8,4% адпаведна. Найбольшае падзенне цэнаў у лістападзе зафіксавана на рынку нафтапрадуктаў — мазут патаннеў на 43,4%, бензін — на 20,6%, дызельнае паліва — на 17,6%. Зрэшты, шараговыя спажыўцы такога рэзкага спаду амаль не адчулі. Нешта падобнае назіралася ў Беларусі, калі ўрад да апошняга цягнуў са зніжэннем цэнаў на бензін для насельніцтва.

Рэцэсія кранае ўсе галіны эканомікі. Найперш спад вытворчасці ўдарыць па машынабудаванні і ў здабываючай прамысловасці, то бок галінах, якія ў большай ступені залежаць ад інвестыцый, а таксама па металургіі і вытворчасці мінеральных угнаенняў, цэны на якія рэзка ўпалі. Апошняе — трывожны званочак для Беларускай калійнай кампаніі.

Расійскія металургічныя канцэрны пачалі скарачаць аб'ёмы вытворчасці і звальняць персанал. Прычына — рэзкае падзенне цэнаў на метал (амаль у два разы), якое робіць вытворчасць нерэнтабельнай. Пра скарачэнне вытворчасці заявіў «Русал», кантраляваны Алегам Дзерыпаскам, пра поўнае спыненне вытворчасці паведамілі некаторыя алюмініевыя камбінаты. «Нарнікель» пакуль не скараціў вытворчасці асноўнай прадукцыі, але кіраўніцтва кампаніі заявіла пра звальненне каля 1400 супрацоўнікаў.

**Сямён Печанко**

# Крэдыты падаражэюць ізноў

Нацыянальны банк Беларусі з 17 снежня павысіў стаўку рэфінансавання з 11% да 12%.

Галоўная фінансавая ўстанова краіны тлумачыць павышэнне стаўкі тым, што гэта робіцца «дзеля павышэння даходнасці ашчаджэнняў у нацыянальнай валюце і далейшай прыцягальнасці ўкладаў».

Ад нядаўняга часу павышэнне стаўкі рэфінансавання (СР) штомесяц стала «добрай традыцыяй».

1 ліпеня СР вырасла на 0,25% і склала 10,25%, 13 верасня яна вырасла да 10,5%, 15 кастрычніка — да 10,75 % гадавых, 15 лістапада — да 11%.

Гэтым разам стаўка рэфінансавання павышаецца не на чвэрць працэнтнага пункта, а адразу на адзін працэнтны пункт.

Павышэнне стаўкі рэфінансавання таксама азначае, што вырастуць стаўкі па крэдытах. Банкі, устанаўліваючы сваю стаўку, арыентуюцца на стаўку рэфінансавання і дадаюць свой інтарэс.

Тым часам у ЗША Федэральная рэзервовая сістэма знізіла стаўку рэфінансавання да фантастычна нізкіх 0,25%. Эканоміка ЗША перабывае ў крызісе, і людзей заахвочваюць браць крэдыты на жыллё, каб хоць крыху ажывіць крэдытны рынак. Крызіс па амерыканскіх мерках — гэта спыненне росту.

Але блізкая да нуля ці нулявая стаўка рэфінансавання павялічвае рызыку дэфляцыі, або працэсу зніжэння цэнаў, што з'яўляецца не менш небяспечным, чым інфляцыя. У дэфляцыйнай атмасферы спажывец пастаянна чакае яшчэ большага зніжэння цэн і адкладае пакупкі, што прыводзіць да яшчэ большага запавольвання тэмпаў развіцця эканомікі.

Стаўка рэфінансавання яшчэ ў верасні 2007 году ў ЗША складала 5,25%.

**АГ**

# Сэкс аказаўся крайнім

Беларускія кідальнікі молату Вадзім Дзеватоўскі і Іван Ціхан **(на фота)** патлумачылі павышанае ўтрыманне тэстастэрону ў арганізме, доўгім устрыманнем ад сэксу. Пра гэта паведамляе агентцва спартовых навін «Весь спорт».

Абодва атлеты напісалі ў сваіх тлумачальных запісках, што два месяцы да Алімпіяды не займаліся сэксам, а Ціхан таксама заявіў, што сядзеў на спецыяльный дыеце з морапрадуктаў і «ганадаў буйной рагатай жывёлы мужчынскага полу».

На што толькі ні пойдзеш, каб сорам прыкрыць.

Нагадаем, што беларускія прызёры Алімпіяды-2008 у кіданні молату Вадзім Дзеватоўскі і Іван Ціхан рашэннем Міжнароднага алімпійскага камітэту былі пазбаўленыя сваіх узнагарод. Дзеватоўскі, што заняў 2-е месца, пажыццёва адлучаны ад спорту, бо гэта ўжо другі выпадак у яго кар'еры, калі спартоўца заспелі на допінгу. Ціхан пакараны двухгадовай дыскваліфікацыяй. Допінг-спробы, што былі ўзятыя па сканчэнні алімпійскіх спаборніцтваў у Пекіне, паказалі, што ў крыві малатабойцаў значна перавышаны ўзровень тэстастэрону.

Ганады — гэта палавыя залозы, органы, якія ўтвараюць палавыя клеткі ў жывёл і чалавека.

**Дзеватоўскі і Ціхан: лузеры ці вінеры? Адказвае Марыйка Мартысевіч, літаратарка, аўтарка артыкулу «Мужчыны, якіх мы выбіраем».**

Фармальна, паводле алімпійскіх законаў, канечне, не. Але, паколькі яны самі перакананыя, што перамаглі, дык значыцца яны насамрэч пераможцы. Бо для мужчыны найперш важна, што мяркуе пра сябе ён сам, а не нейкія там алімпійскія камітэты. Па-другое, наколькі мне вядома, калі спартоўцу хапае сэксу на Алімпіядзе, значыць, ён сышоў з дыстанцыі на самым пачатку — і мае час на забавы. Нашы ж дайшлі да самай вяршыні, трэніраваліся, не мелі права расслабляцца — так што іх тлумачэнні здаюцца праўдападобнымі.

**ЛК**




NOC.BY

## ЦЫТАТА

### Дзеватоўскі: «Раю займацца добрымі справамі»

Адразу па парламенцкіх выбарах малатабоец Вадзім Дзеватоўскі даў інтэрв'ю для БТ. Наконт апазіцыі. «Я раю апазіцыі займацца добрымі справамі, а не мітынгамі», — сказаў атлет, якога на 29 верасня ўжо злавілі на ўжыванні допінгу.

«Апазіцыі трэба ладзіць суботнікі ці пералічваць частку заробленых грошай на добрую справу, і людзі на гэта адгукнуцца», — сказаў В.Дзеватоўскі.

Дарэчы, навіна пра дыскваліфікацыю двух прызёраў Пекінскай Алімпіяды ішла першай у выніковай перадачы «Панарама тыдня» на БТ. Бачылі ж зноў класіку жанру — вінаватыя ўсе, апроч саміх атлетаў і іх трэнераў. Чарговая міжнародная змова.

**ЗП**

# Запаветы Суворава для беларускіх сіротаў

**У адным з сталічных дзіцячых санаторыяў дзецям раздавалі яркія сшыткі, аздобленыя заклікамі «быць вернымі Расіі».**




«Помни, чьё имя носишь!» — нагадвае надпіс на вокладцы сшыткаў, надрукаваных у Расіі на замову Маскоўскай нахімаўска-сувораўскай садружнасці. Тут жа размешчаныя выявы Суворава, эмблемы вучэльняў яго імя ды ўласна гадаванцы вайсковай установы. Такія сшыткі ў вялікай колькасці былі падораныя расійскімі кадэтамі аднаму са сталічных дзіцячых санаторыяў, які яшчэ на пачатку году быў інтэрнатам для сіротаў. Што яшчэ чакала беларускіх дзяцей на вокладках тых сшыткаў? Кодэкс гонару расійскага кадэта які акрамя ўсяго іншага заклікае «быць верным Расіі, паважаць і трымацца традыцый Расійскай Арміі». Але галоўны сюрпрыз чакае на апошняй старонцы вокладкі, якую цалкам займае запавет Фельдмаршала Аляксандра Васілевіча Суворава, графа Рымнікійскага, князя Італійскага. «Здраствуйте, братцы, чудо-богатыри, любезнейшие друзья мои! (...) Помилуй Бог: мы Русские! Восстановим попрежнему веру в Бога Милостивого. Очистим беззаконие. Везде фронт. (...) Неприятель от вас дрожит. Вы — Русские! Во языцех — оружию Российскому — вековечная слава! Слава! Слава! Слава!»

Сувораў — герой для Расіі. Для беларусаў жа ён — крывавы заваёўнік.

Мы наўмысна не падаем назву інтэрнату — вінаватыя не загадчыкі, а сістэма, якая выстаўляе беларусаў «таксама расейцамі».

У Мінскай вайсковай сувораўскай вучэльні паведамілі, што яе гадаванцы не карыстаюцца сшыткамі, надрукаванымі ў Расіі: «Гэта выключана, нашы сувораўцы пішуць у беларускіх сшытках».

**СП**

## ДЗЯРЖАЎНАЯ ІДЭАЛОГІЯ

### Групавы сэкс на сямейным тэлеканале

На «Ладзе» ў ток-шоу «Касмаполітэн» кабетка (відавочна нейкая зорка лукашысцкай эстрады) распавядае, што спрабавала групавы сэкс. Потым, рагочучы, пачала гаварыць пра свае візіты ў сэксшопы. Вагіны і завадныя пенісы і г.д.

Потым яна з смехам пытаецца:

— Ці пусцяць гэта ў эфір?

— У нас всё можно! — радасна гігікае вядоўца.

Я так зразумеў, што з «ідэалогіяй» гэтыя выкрунтасы ўзгоднілі. Адліга ўсё ж такі.

**Запісаў аўтар інтэрнэт-дзённіка poczobut.livejournal.com**

## СЦІСЛА

### Скарацілі.бай

Сайт пад назвай Sokratili.by з'явіўся ў БелНэце. «Завод «Ударнік». Трэці дзень сядзім без заробку» — паведамленні такога кшталту сцякаюцца туды. Аўтар збірае інфармацыю са свету і Беларусі. Пачынаюць пісаць туды і чытачы — сайт разлічаны на інтэрактыўнасць. А кім створаны сайт і кім кіруецца — пакуль невядома.

**МБ**

### Хуткасны інтэрнэт у 80% школаў

Каля 80% беларускіх школаў плануецца забяспечыць шырокапалосным высокахуткасным доступам у інтэрнэт, паведамляе Мінадукацыі. Сёньня, паводле статыстыкі, 98% школаў маюць інтэрнэт. Аднак часам гэта камп'ютэр і мадэм у дырэктара школы, якія дазваляюць прымаць электронную пошту.

**Паводле БелаПАН**

### Зайцы знікаюць

Апошнія пяць гадоў зімы збольшага без снегу, яны псуюць і без таго нялёгкае жыццё вушастых белякоў, якія — усё яшчэ па-старому — мімікруюць пад снег.

Сёлета зайцы панеслі нечуваныя страты ад драпежнікаў.

Прагнозы навукоўцаў не суцяшальныя: зайцы наагул могуць сысці на поўнач.

Ігар Мядзведзеў, старшы навуковы супрацоўнік Бярэзінскага біясфернага запаведніку кажа: «Вось цяпер сярэдзіна снежня, а снегу няма. Заяц-бяляк ужо даўно паліняў, стаў бялюткім. Толькі кончыкі вушэй у яго чорныя — і яго паўсюль можна адшукаць. Драпежніку наогул проста яго знайсці».

**Паводле РЕН ТВ, Беларусь**

## Дыякан

Вось чаго я ніколі сабе ўявіць не мог, дык гэта таго, што жвавага, з жывымі, быстрымі вачамі, не пазбаўленага артыстычных здольнасцяў рагатуна праз нейкі час буду називаць бацюшкам. А ён неяк хутка — ці не пад уплывам свайго большага брата Сяргея? — стаў царкоўным чалавекам.

У 1990 годзе на Бацькаўшчыне толькі-толькі пачала адраджацца Унія, а ўжо ў 1991 годзе прэфект Кангрэгацыі ўсходніх цэркваў паківаў беларусам і ўкраінцам пальцам: каб больш такога не было.

Гэта значыць, каб не высвячалі на дыяканаў надта маладых людзей. Бо і праўда, у траўні 1991-га, калі яго высвяціў біскуп Сафрон Дмытэрка, дыякан грэка-каталіцкай парафіі Святога Язэпа ў Мінску толькі што ўступіў у дваццаць другі год жыцця.

У пробашча парафіі, айца Яна Матусевіча, з'явіўся галасісты і ўсмешлівы памочнік і, як стала вядома пазней, пераемнік.

Ён і цяпер — ужо мужчына сталага веку, бацька траіх дзяцей — усмешлівы і любіць пажартаваць. Магчыма, за гэта яго любяць дзеці парафіянаў.

Ужо даўнавата іярэй, ужо нават протапрэсвітэр, дэкан грэка-каталіцкіх парафіяў у Мінску, Мінскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, ён у душы застаецца тым маладым дыяканам. І калі спеў парафіянаў бывае не надта стройны і дружны, з алтара падае свой голас бацюшка, і ўсё наладжваецца як трэба.

> 10 гадоў святарскага служэння айца Андрэя Абламейкі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Калі згадаць, што дыякан (diakonos) — гэта слуга, служыцель, дык гэтае слова, гэтае званне стасуецца да кожнага святара, бо хто такі святар, калі не слуга Божы і не слуга слугаў Божых?

Такім слугой з'яўляецца, па-мойму, і айцец Андрэй Абламейка. 16 снежня споўнілася 10 гадоў з таго часу, як мітрапаліт Іван Мартыняк высвяціў яго на святара. У гэты дзень ён будзе, як заўсёды, служыць.

**Анатоль Сідарэвіч**



## Беларуская ялінка ў Нью-Джэрсі

**Музей амерыканска-венгерскай фундацыі (New Brunswick) правёў фестываль калядных ялінак прадстаўнікоў розных этнічных супольнасцей. На шыльдачках пад ялінкамі пазначана: Амерыка, Беларусь, Венгрыя, Данія, Латвія... Беларусы ўпрыгожылі сваю саламянымі цацкамі (на фота). Ялінкі будуць экспанавацца да 25 студзеня, наведнікамі музею ў гэты час будуць школьнікі.**
**ВТ, Нью-Брансвік (ЗША)**

## УДАКЛАДНЕННЕ

### Кротус Генус ніколі не быў за мяжой

У «НН» №43 у артыкуле пра Генадзя Кісялёва «Атлант пакінуў неба» прайшла істотная недакладнасць для жыццяпісу выдатнага даследніка: «У Мінску, Вільні, *Кракаве і Варшаве*, у картках, узятых для прагляду рукапісаў, нязменна знаходзіцца подпіс Генадзя Кісялёва...»

Я ж сцвярджаю адваротнае: Кротус Генус за мяжою аніколі не быў. Ну, у тым, савецкім разуменні. У адрозненне ад усіх больш-менш вядомых архівістаў-даследнікаў XIX ст. Сцяпана Александровіча або Уладзіміра Казберука, Уладзіміра Мархеля ці Леаніды Малаш. Не кажучы пра Адама Мальдзіса, які прашнураваў архівы Еўропы ад паўночнай Англіі да паўднёвай Італіі.

Гэта я ведаю пэўна, адседзеўшы з легендарным архівістам 22 гады ў адным акадэмічным пакоі №205. Бо мой старэйшы найпаважанейшы калега заўсёды прасіў мяне, прынагодна, у Варшаве ці Вільні, Кракаве або Вроцлаве адшукаць тую або іншую, вядомую яму па каталогах, пазіцыю, зверыць цытату, прывезці адбітак публікацыі пра Сыракомлю або малавядомы артыкул Слупскага.

**Язэп Янушкевіч**

**Ад аўтара.** Аберацыю памяці патлумачыць проста: Генадзь Кісялёў сапраўды здаваўся ўсёведным і ўсюдыісным. І тое, што ўсе свае унікальныя археаграфічныя і крыніцазнаўчыя адкрыцці Генадзь Васілевіч зрабіў не выязджаючы з краіны (у тагачасным разуменні), робіць яго навуковы подзвіг яшчэ больш важкім. Выбачаюся перад чытачамі «НН».

**Аляксандр Фядута**

## Розніца між Талачынскім і Аршанскім

**Быў у камандзіроўцы на паўночным усходзе Беларусі.** Уразіла: у Талачынскім раёне ўсе дарожныя шыльды па-расійску, а ў Аршанскім — па-беларуску. Чаму так, цікава?

**Валеры, Мінск**

## Фінансавы крызіс дайшоў да школы

**На галоўнай старонцы сайту нацыянальнага інстытуту адукацыі adu.by** з'явіліся «Праграмы ўступных экзаменаў» па ўсіх прадметах, акрам, чамусьці, гісторыі Беларусі. Праграмы скарочаныя, каб адпавядаць ведам тых, хто праходзіць за адзін год курсы 10 і 11 класаў.

> З тэстаў выключанае пытанне «Войны ВКЛ з усходняй суседняй дзяржавай».

А што ж скарацілі па гісторыі? Я знайшла гэтую інфармацыю толькі на сайце БЕЛТА: «адбор матэрыялу здзейснены з улікам працы па ліквідацыі перагрузкі вучняў». Вучняў вырашылі «не грузіць» «спрэчнымі» пытаннямі з гісторыі: з уступных тэстаў выключаныя пытанні «Тэрыторыя Беларусі», «Памежныя канфлікты і войны ВКЛ з усходняй суседняй дзяржавай» (!), «Шматэтнічная Рэч Паспалітая» і г.д.

Незразумела, што ж застаецца пытаць на экзаменах.

**Паўліна Купрысь, Ждановічы (Мінскі р-н)**

## Ціснуць за неўступленне ў БРСМ

**5 снежня навучэнец 10 класу сярэдняй школы №1 г. Докшыцы Павал Малюжанец быў выкліканы на гутарку да дырэктара школы Уладзіміра Арціёмёнка і намесніка дырэктара па выхаваўчай працы Святланы Вялічка.** Падставай для гутаркі было прынцыповае нежаданне Паўла ўступаць у БРСМ. Аднакласнікі амаль усе на маім баку — чакалі мяне пад дзвярыма кабінета дырэктара». У той жа дзень быў выклікан да дырэктара настаўнік замежнай мовы Уладзімір Мядзюха, які на адным з урокаў негатыўна выказаўся пра БРСМ.

**Кастусь Шыталь, Докшыцы**

## За здаровы лад жыцця!

**Вяду здаровы лад жыцця.** Не п'ю алкаголю, не куру. Выратаваў трох тапельцаў: хлопчыка 9 гадоў (Балтыйскае мора); дзяўчыну 15 гадоў у вадаёме Смаленскай ТЭЦ-2; дзяўчынку 7 гадоў вадаём ст.Бобр Крупскага раёна. А чаму я такі бадзёры ў свае сталыя гады? Бо займацца спортам — гэта шлях да здароўя. Удзельнічаю ўвесну і ўвосень у сельскагаспадарчых працах, выконваю пасільную, але вельмі важную працу.

> Я выратаваў трох тапельцаў. Чаму?

**Мікалай Сталяроў, Бобр (Крупскі р-н)**

## Навала

**У пакалення вяскоўцаў, дзяцінства якога супала з пачаткам 1930-х гадоў, калектывізацыяй, яркіх успамінаў засталося няшмат.** Для мяне асабіста — калі ўпершыню ўбачыў у небе над вёскай самалёт-кукурузнік У-2, шумны, з бразганнем вузкіх гусеніцаў, праезд па вуліцы танкеткі. І наведванне ў хату старшыні Пагосцкага сельсавету Крыжа, які, паклаўшы на стол наган з абшмальцаваным да бляску ствалом, угаворваў бацьку хутчэй уступаць у калгас, калі не хоча за Котлас.

Але найболей уражанняў прынёс зімовы дзень, калі ў хату зайшла босая жанчына ў доўгай зрэбнай кашулі, без хусткі, з пасінелымі ад холаду рукамі і нейкімі ўстрывожанымі вачыма. Нічога не кажучы, яна нагнулася над карытам, у якое маці высыпала для свіней бульбу, стала хапаць гарачыя клубні і, не абіраючы, таропка есці. Мяне і старэйшага на год брата, з якім мы сядзелі на печы, сняданак госці напалохаў.

> Успамін з часоў калектывізацыі.

Маці называла жанчыну Волькай, прасіла не есці з карыта, адрэзала скрылік сала і акраец хлеба.

Жанчына іх умяла ўвачавідкі, нешта гаварыла незразумелае для нас, а потым выйшла з хаты. Мы з братам кінуліся да акна — хацелася паглядзець, як гэтая Волька ідзе басанож па снезе.

Волька была старэйшай з дзяцей у сям'і аднавяскоўца Наруцкага, хутар якога знаходзіўся ў самым канцы вёскі Кутнеў. Меў ён невялікі надзел зямлі, трымаў двое коней, тры каровы, упраўляцца па гаспадарцы дапамагалі дарослыя сыны. Дачка ад раджэння была псіхічна хворай. Калі сям'ю раскулачылі і выслалі за Котлас, Волька засталася адна ў пустой хаце. Камбедчыкі яе не рашыліся адправіць разам з бацькам і братамі.

Калі хату разабралі, Волька начавала ў пустым гумне, жабравала. Перад вясной яна ўжо не паяўлялася на вуліцы. Хворую жанчыну альбо адправілі ў Магілёўскую псіхлячэбніцу, альбо як «класавы элемент», у Курапаты — следу не засталося. Ніхто з яе родных з высылкі не вярнуўся — як і сотні тысяч бязвінна высланых на выміранне на поўнач беларусаў.

Не засталося следу і ад хутару Наўруцкіх, іх вялікі сад пасля вайны высеклі, а зямлю ўвялі ў калгасны клін. Паблізу месца, дзе стаяла хата, засталася адзінокая бяроза — апошняя сведка загубленага падворку.

**Міхась Тычына, Слуцк**

## ЗБМА адсвяткаваў распад СССР

**13 снежня Згуртаванне беларускай моладзі Амерыкі і Беларуска-амерыканскае задзіночанне зладзілі акцыю** ў гадавіну распаду СССР ля рэзыдэнцыі мэра Нью-Йорку на Манхэтане.

**Мікола Цімашэнка, Нью-Ёрк**

## АБВЕСТКІ

### Маладым талентам!

**Ты малюеш ці пішаш вершы, можа, вышываеш ці займаешся іншай творчасцю?** Ты любіш Беларусь? То прызнайся ёй у любові — прымі ўдзел у выставе сучаснай моладзевай творчасці «Беларусь у сэрцы», адкрыццё якой адбудзецца напярэдадні Калядаў, 22 снежня, ў Сядзібе БНФ, што знаходзіцца па адрэсе Машэрава, 8 (станцыя мэтро «Плошча Перамогі»). Работы прымаюцца да 19 снежня ўключна. Распавядзі пра сваю Беларусь!

**Наста Мурашка**

### Конкурс імя Ежы Гедройца

**Польскі Інстытут у Мінску абвяшчае IX Конкурс імя Ежы Гедройца на лепшую журналісцкую працу** ў беларускіх СМІ за 2008 г. на тэму польска-беларускіх адносін у галіне культуры, навукі і мастацтва.

Умовай удзелу ў конкурсе з'яўляецца прадстаўленне да 31 студзеня ў Польскі Інстытут у Мінску арыгіналаў альбо копій апублікаваных у 2008 г. артыкулаў, гука- і відэазапісаў перадач з пазначэннем даты публікацыі, трансляцыі, а таксама з паданнем інфармацыі пра аўтара: месца працы і пасада, паштовы адрас, кантактны тэлефон.

Дасылаць на адрас: Польскі Інстытут ў Мінску, вул. Валадарскага 6, 220050 Мінск (з пазначэннем «на конкурс»). Т.: (017) 200-63-78, 200-95-81; факс: 200-48-74; e-mail: instpol@instpol.by

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Любіць Беларусь

**608-старонкавы том Паўла Севярынца «Люблю Беларусь: 200 феноменаў нацыянальнай ідэі» выйшаў у цвёрдай вокладцы ў серыі «Кнігарня «Наша Ніва».**

Нацыянальную ідэю спрабавалі выразіць і нашаніўцы пачатку XX ст., і адраджэнцы найноўшага часу. Але ўсе яны ставілі за мэту давесці самім беларусам і астатняму свету, што мы ёсць. Што мы народ, не горшы за іншых. А пытанні «Навошта мы тут?», «Куды ідзем?» і, урэшце, «У чым сэнс?» — пытанні, на якія любая нацыя адказвае найперш, заставаліся на другім плане. У выніку замест таго, каб сцвердзіць мэту, мы бралі ў аснову гістарычную задачу — стварыць дзяржаву.

Цяпер жа Беларусь, маладая краіна, знаходзіцца ў пошуках ідэі, ідэалу, які, мусіць, размяшчаецца не на паперы, не ў музеі, а ў сэрцы кожнага. У сваёй кнізе «Люблю Беларусь» палітык і былы палітвязень Павал Севярынец крэсліць сваю візію Беларусі ідэальнай. Постаці гісторыі — Гедымін і Францішак Скарына, Міхал Клеафас Агінскі і Максім, нашы прамысловыя набыткі — трактары і «БелАЗы», нафтахімічная і металургічная прамысловасць, а таксама феномены беларускага духоўнага жыцця — рэлігійная талеранцыя і царкоўная унія трапляюць у перыядычную табліцу вядомых фактаў, складаюцца-сыходзяцца ў Севярынцавай мадэлі ідэалу.

**Лявон К**




PHOTO.BYMEDIA.NET

## Уладзімір Арлоў — гэта...

не толькі папяровыя кнігі.

Выйшла ў свет аўдыёкніга Уладзіміра Арлова «Ордэн Белай Мышы», якая ўключае 11 кароткіх апавяданняў і 7 эсэ. Тут акрамя аднайменнага апавядання выкладзеныя такія забойныя творы, як «Рэквіем для бензапілы» і «Мой знаёмы забойца Сяргей», а таксама эсэ-гімн «Незалежнасць — гэта...».

Кажа Уладзімір Арлоў: «Апавяданні начытваў я сам. У творчым працэсе сутыкнуўся з праблемай ненарматыўнай лексікі. Не буду казаць, як я развязаў гэтую праблему — хай шаноўныя слухачы самі пачуюць».

**У працэсе начытвання Арлоў сутыкнуўся з праблемай нецэнзурнай лексікі ва ўласных творах.**

Яшчэ раней у Арлова выйшлі 5 кніг для праслухоўвання: «Час чумы», «Адкуль наш род», «Таямніцы полацкай гісторыі», «Сны імператара» і «Паўстанцы». Большасць аўдыёкніг не зусім супадаюць з папяровай версіяй, а «Паўстанцаў» дык увогуле не было ў папяровым фармаце.

«Да Калядаў спадзяюся пацешыць слухачоў: завяршыць сваю аўдыёкніжную серыю», — дадае Арлоў. «Апошнім фрагментам мусіць стаць «Паром праз Ла-Манш», куды ўвойдуць мае паэтычныя творы».

**Лявон К**

## «Імперыя» Капусцінскага па-беларуску

Рышард Капусцінскі (1932—2007) — легенда польскай журналістыкі, сусветна вядомы рэпарцёр, пісьменнік, паэт. Чалавек з унікальным пачуццём падзеі, якое беспамылкова вяло яго туды, дзе рабілася гісторыя. Ён быў сведкам дзесяткаў пераваротаў і рэвалюцыяў, руйнавання імперыяў і з'яўлення новых дзяржаваў.

Яговыя кнігі не раз былі прызнаныя кнігамі году паводле меркавання ўплывовых выданняў, а ў 1995 годзе ў Польшчы Капусцінскага абвесцілі журналістам стагоддзя. Двойчы намінаваўся на Нобелеўскую прэмію.

Капусцінскі нарадзіўся ў Пінску і на ўсё жыццё захаваў прыхільнасць да Беларусі. Ён не раз гаварыў: «Я заўсёды шукаў мой дом, шукаў Пінск — у Афрыцы, у Азіі, у Лацінскай Амерыцы».

«Імперыю» пераклаў Яўген Саляйчук, перакладчык з Пінску. Гэтая кніга апісвае падарожжа аўтара праз усю савецкую імперыю, здзейсненае ў канцы 1980-х. Капусцінскі па-журналісцку дакладна выпісвае заўважаныя светапоглядныя і побытавыя дэталі, якіх не знойдзеш у падручніках гісторыі таго часу.

**Імперыя / Рышард Капусцінскі**; пераклад з польскай. — Мінск: Логвінаў, 2009. — 344 с. (Кнігарня «Наша Ніва»).

## СЦІСЛА

### Беларускі царкоўны каляндар на 2009

У грэка-каталіцкай парафіі Святапакутніка Язафата ў Полацку выйшаў насценны ўніяцкі каляндар на 2009 год.

Такі каляндар — ужо добрая традыцыя. Ён, як і заўсёды, па-беларуску. Назвы месяцаў і дзён тыдня прадубляваныя па-англійску. Кніга аздобленая здымкамі малавядомых уніяцкіх цэркваў з розных куткоў Беларусі і ўзбагачаная кароткім нарысам гісторыі Мінскага дэканату.




### «Чалавек, які скраў Сцяну Плачу»

У Мінску адбылася прэзентацыя кнігі «Чалавек, які скраў Сцяну Плачу». Яна выйшла ў выдавецтве «Логвінаў».

У кнігу ўвайшлі 15 кароткіх апавяданняў дзесяці вядомых ізраільскіх пісьменнікаў у перакладзе журналіста «НН» Паўла Касцюкевіча. Сярод іх — апавяданні Этгара Керэта, знаёмага па кнізе «Кіроўца аўтобуса, які хацеў стаць Богам», перакладзенай з іўрыту на беларускую мову П.Касцюкевічам; творы Амоса Оза, Меіра Шалева, сатырыка Эфраіма Кішона.

### Абвешчаныя намінанты на «Залаты глобус»

Галоўныя фаварыты — «Дзіўная справа Бенджаміна Батана», «Сумнеў» і «Фрост супраць Ніксана». «Залаты глобус», які называюць перадоскараўскай рэпетыцыяй, будзе праходзіць у 66-ты раз.

«Дзіўная справа», напрыклад, намінуецца ў пяці катэгорыях: «найлепшы выканаўца мужчынскай ролі», «найлепшая драма», «найлепшы сцэнар», «найлепшы рэжысёр» і «найлепшая музыка».

### Беларускія казкі ў перакладзе на англійскую

Радыёстанцыя «Беларусь» на гэтым тыдні падарыла вучням мінскай гімназіі № 23 аўдыёзборнік беларускіх народных казак на англійскай мове.

У зборнік увайшлі творы, перакладзеныя супрацоўнікамі радыёстанцыі ў рамках праекту «Чароўны куфэрак». Дзякуючы яму ў многіх краінах пачулі больш за паўсотню беларускіх казак, перакладзеных на англійскую мову.

**Лявон К, ул. інф.; БелаПАН**

# Новы праект Вольскіх




Супольны музычны праект, зроблены ў стылістыцы 60-х, песні да якога напісаў Лявон Вольскі, на завяршальным этапе падрыхтоўкі. У Мінску адбыліся здыманні відэакліпаў да 11 песняў. У запісе кліпаў — сузор'е: Лявон Вольскі, Павал Булатнікаў з «Ляпіса трубяцкога», Алег Хаменка («Палац», у праекце выконвае ролю Мао Цзэдуна), Уладзімір Пугач (J:Mors), Віталь Артыст («Без Білета»), Андрэй Такіндант («Рэха»), акторы Святлана Зелянкоўская, Ганна Хітрык і Алег Гарбуз.

Сюжэт наступны: жыхары аграгарадку збіраюцца вакол тэлевізара і глядзяць рэтракліпы. Назва праекту таксама пакуль што схематычная: ініцыятары Лявон і Ганна Вольскія падаюць працоўную назву «супольны музычны праект у стылі 60-х». «Народны альбом-ІІ: 20 гадоў пасля»?

Агорацль новы музычны праект лявон Вольскі і К спадзяюцца «да кітайскага Новага году».

**Павал Касцюкевіч**

# Якія планы ў рокераў?

Адказваюць беларускія музыкі.

**Дзяніс Тарасенка, гурт «Разбітае сэрца пацана»:** План адзін — сусветнае панаванне. З блізкіх мэтаў — акупаваць музычны рынак на гэтай планеце. З далёкасяжных — захапіць душы і сэрцы зямлянаў.

**Кірыла Богуш, гурт Tlusta-Lusta:** Кліп запісаць — ідуць перамовы з «Белсатам». У нас жа альбом выйшаў — «Blin piersy» называецца. Граем кавэр для «Нейра Дзюбеля», песня «Пацалунак».

**Аляксандр Кулінковіч, гурт «Нейра Дзюбель»:** Планаў ніякіх. Мы тут усе ў канікулах-адпачынках. Вось пішуць на нас трыб'ют іншыя гурты, але ў гэтым мы ўдзелаў не бярэм, мы тут бок прымаючы. Адно слухаем.

**Юры Паўлоўскі, бубнач «Тройцы»:** Выдаць пад Новы год эксперыментальны альбом «Жар-Жар»: там больш сінтэзатараў, электронікі, дадатковых бубнаў, адным словам, шмат неўласцівага «Тройцы».

**Апытваў**
**Павал Касцюкевіч**

# Рэкамендавана для прагляду слухачам школы КДБ

У Мінску паказалі фільм Анджэя Вайды «Катынь». Піша **Наталка Бабіна**.




Вядома, гэта пасланне да расійцаў і да немцаў.

Палякі — ды і мы, беларусы, — пра гэта ведаем.

Мы ведаем факты. Нас цікавіць, нас шакуе пытанне: ЯК такое магло здарыцца? КІМ трэба быць, каб такое ўтварыць?

Але ёсць мільёны людзей — у Расіі, у Нямеччыне, у Амерыцы ды і ці мала дзе на зямной кулі — якія слыхам не чулі пра расстрэл 15 000 польскіх афіцэраў, настаўнікаў, асаднікаў саветамі ў 1940 годзе. Яны проста не ў курсе.

Гэты фільм зняты для іх. Гэты фільм зняты для Уладзіміра Уладзіміравіча Пуціна асабіста. Пра гэта гаворыць і сам славуты рэжысёр, Анджэй Вайда у рэкламным роліку, які папярэднічае паказу фільма. Ён гаворыць: канцлерка Германіі пані Ангела Меркель была на прэм'ерным паказе фільму ў Германіі; я спадзяюся, Уладзімір Пуцін таксама будзе на расійскай прэм'еры... Ён гаворыць: я спадзяюся, факты, паказаныя ў фільме, будуць успрыняты як нашая супольная еўрапейская гісторыя.

Пуцін не быў на прэм'еры.

У Расіі факты не будуць успрынятыя.

«Некалі «Катынь» пакажуць па дзяржаўным канале Расійскага тэлебачання — хочацца да гэтага дажыць, бо гэта будзе ўжо зусім іншая Расія. У гэтай — «Катынь» не пакажуць амаль нідзе», — пэўны расійскі журналіст Віктар Шэндэровіч.

> Гэты фільм пакажуць у Расіі, калі гэта будзе зусім іншая Расія.

Задумайцеся, чаму?

На паказе славутага фільму «Катынь», які быў арганізаваны ў Мінску польскай амбасадай і Польскім інстытутам, я заўважыла многа апазіцыйных дзеячаў, незалежных журналістаў... Ах, калі б шаноўныя амбасада і Інстытут мелі магчымасць арганізаваць яшчэ адзін паказ, спецыяльна для супрацоўнікаў будынку, які знаходзіцца побач з кінатэатрам «Цэнтральны», дзе дэманстравалася стужка! Для супрацоўнікаў беларускага КДБ, якіх цяпер вучаць ганарыцца традыцыямі чэкістаў. Для тых, хто цяпер на кані. Бо гэты фільм найперш для іх, дэзарыентаваных і дэмаралізаваных.

Мяне вельмі ўразіў гэты рэжысёрскі прыём: зацяняць, не паказваць твары катаў. Тых, хто страляў. Тых, хто арыштоўваў на смерць. Мы бачым толькі сілуэты.

Славуты Анджэй Вайда АДМАЎЛЯЕЦЦА ПАКАЗВАЦЬ катаў. Ён адмаўляецца іх разумець.

Ці НЕ МОЖА зразумець бесчалавечнасць?

Ці НЕ ХОЧА ўдумвацца ў яе ў сваё 80 год?

Пакінем гэтыя пытанні без адказу: ён, гэты адказ, і непатрэбны.

Пан Анджэй давёў сваю геніяльнасць і свой прафесіяналізм шмат гадоў раней. «Попел і алмаз» ды «Чалавек з мармуру» застануцца культавымі фільмамі майго пакалення, нават тады, калі пакаленне вымрэ ўшчэнт...

На пытанне «ЯК такое магло адбыцца? КІМ трэба быць, каб здзейсніць такое?» рэжысёр нават не спрабуе адказаць.

Ён ставіць перад сабой іншую мэту.

Каб гэтая мэта была дасягнутая, важна, каб фільм паглядзелі гэбісты Важна, каб фільм паказалі па тэлебачанні. Але як гэтага дабіцца?

# «Сонцакрыж» Алеся Шатэрніка

Выйшаў альбом-кніга мастака і скульптара Алеся Шатэрніка «Сонцакрыж». Пад адной вокладкай аўтар «Звона Свабоды» і гукальшчыкаў вясны на праспекце Пераможцаў сабраў свой жывапісны, скульптурны і літаратурны даробак.

Калі гартаеш старонкі дыхтоўнага выдання, думаецца: ці не надта хутка беларуская гарадская скульптура перайшла ад сацрэалістычных статуй Азгура да цалкам сімпатычных, але зусім ужо не абцяжараных сэнсава «Курца» і «Дзяўчынкі пад парасонам» Жбанава? Ці не прапусціла цэлае злучво — выявы вядомых постацяў дасавецкай гісторыі: Ефрасінні Полацкай, Усяслава Чарадзея, Тадэвуша Касцюшкі. Эскізы ўжо зробленыя Шатэрнікам. А помнік джазмэну Эдзі Рознеру перад КЗ «Мінск», да прыкладу, глядзеўся б супэр.

**Лявон К**

# Тьон. Вулица. Светец. Травница...

Тьон. Вулица. Светец. Травница.
Безречной и безрудной свет.
Жыруй ешшо хошь полстолеття —
Так само бут. Исходу нет...

Гэты пераклад вядомага верша расійскага паэта Аляксандра Блока «Ноч. Вуліца. Ліхтар. Аптэка» на сібірскую мову быў змешчаны нядаўна на адным з сібірскіх сайтаў — «Сібірска вольгота» («Сібірская свабода») http://volgota.com.

У 1873 г. у Расіі выйшла кніга «Заўвагі і слоўнік сібірскай гаворкі», у прадмове гаварылася пра значнае адрозненне мясцовай граматыкі і лексікі ад рускай. Ёсць гіпотэзы, што на мову сібірскага насельніцтва моцна паўплывалі мовы перасяленцаў з Беларусі і Украіны. Для гаворкі характэрныя цвёрдыя шыпячыя, оканне, прыстаўныя зычныя, спрашчэнні ў збегу зычных і г.д.

Спроба стварэння літаратурнай сібірскай мовы была здзейснена ў 2005 годзе. Мову запусцілі ў інтэрнэт, пасля чаго яна стала ўспрымацца як варыянт інтэрнэтаўскага слэнгу. Пачаў рыхтавацца слоўнік на 15.000 слоў (існуе ў сеціве ў он-лайн фармаце на http://sib.org.ua). З 2006 па 2007 гады нават існаваў патрал Вікіпедыі па-сібірску, на якім мелася амаль 7000 артыкулаў, але ён быў выдалены за «несур'ёзны падыход да тэм і антырускую пазіцыю».

Ідэйныя сібіракі, тым не менш, развіваюць мову, займаючыся перакладамі. На сібірскую ўжо перакладзены «Карсон, которой населившись на корге», часткова Біблія, паэзія, інш.

**Паўліна Купрысь**

# Мужык павінен біцца

**Існуе «раман выхавання», а беларускі блогер Andorac піша «апавяданні выхавання». Вось адно з іх— пра падлеткавыя баі. Ён не вагаецца апісваць рэчаіснасць беларускай вёскі з дапамогай той лексікі, якую ўжывае сельская моладзь. Гэтая публікацыя ў Інтэрнэце выклікала буру. Адны захапляліся навізною, другія праклінaлі за грубую мову.**

Мужык павінен умець біцца. Цвёрда вынес гэта са школы. Хто не ўмее біцца ці пазбягае боек — не зусім паўнавартасны мужык.

Я выдатна помню свой першы выбіты зуб. Гэта было ў першым класе. Я растоўк нос Дзіму Каралёнку. Там асаблівай маёй заслугі не было, разбіць нос Дзіму мог кожны, бо нос у яго быў вельмі слабы. Ледзь што, адразу юшка цячэ. Але Кароль, як мы яго называлі, паскардзіўся Мішу Вяршку, свайму найлепшаму сябру і майму траюраднаму брату. Дакладна помню Мішаў удар у маё грызла, смак крыві і мінус адзін зуб у роце.

Біцца мы баяліся ў класе толькі з Сашам Новікам, бо ён быў нашмат здаравейшы за ўсіх іншых. Але адмыслова дразнілі яго «Пушка-рваная-падушка». Саша раз'юшваўся і усім нам выпісваў п...юлёў. Пазней у Новіка з'явілася новая мянушка «Адам Плуг», яна яму пасавала ідэальна. Але ўсе баяліся Сашу сказаць пра гэтую мянушку. Казалі «Асадасам Плусуг», калі ўжо вельмі ён нас бясіў. Ён рабіў выгляд, што не разумеў. Помню, што ўсе аднакласнікі вельмі радаваліся, калі Плусугаса пакінулі на другі год у першым класе. Калі Саша вучыўся ў восьмым класе, то з ім баяліся выходзіць на разы нават выпускнікі. Сіла ў яго насамрэч дурная.

Па сённяшні пераканаы, што бойкі павінны быць чэснымі, то бок выходзіць трэба па разах. Нейкі перыяд у нашай школе так і было. З раніцы пэўная брыгада прабягала па школе, дзе знаходзіла двух прыкладна аднолькавых па сіле супернікаў. На першым вялікім перапынку, калі ў сталоўку ішлі малыя, старэйшыя пацаны накіроўваліся нібыта ў прыбіральню, яна ў нас была на двары. Там некаторыя пацаны курылі (зрэшты, курыла ўнас вельмі мала людзей). А потым тупалі ў глыб леса. Там была невялікая прагалінка, дзе і пачыналіся турніры. Байцы скідвалі курткі і пачыналі кружыць адзін вакол другога, як пеўні. А мы проста глядзелі за гэтай дзеяй. А потым была кроў на сумётах, мноства фінгалаў. Гэта працягвалася да той пары, пакуль наш байцоўскі клуб не засяклі настаўнікі. Перакананы, што ў тых баях мы добра загартоўваліся. Колькі разоў і мне даводзілася ўдзельнічаць у такіх бойках.

Нячэсныя бойкі часта адбываліся «на бульбе». Былі такія браты Ясюкі, якіх у вёсцы называлі Мажджарамі. Дык вось два старэйшыя Мажджары вышуквалі ахвяру і нацкоўвалі на яе трох малодшых Мажджаратаў. Трое на аднаго. Звычайна Міша Клэпша кідаўся суперніку ў ногі і завальваў яго, а Ігар Срулька і Жэня Белы навальваліся на іх зверху. Білі жорстка. Усё было да той пары, пакуль Мажджараты не напалі на Лёшу Жогана. Ляхан не разгубіўся, схапіў Белага, засунуў яму два пальцы ў рот і абяцаў раздзерці пашчу. Двое астатніх перапалохана адступілі. Жыган жа быў цвёрды ў сваіх намерах, бо перад гэтым яны памялі яму ладна бакі. Ледзь угаварылі, каб адпусціў. Болей гэтая тройца ні на кога не нападала. З ваўкамі жыць — паваўчынаму выць.

А яшчэ памятаецца, як у вёсцы з'явіўся прыезджы хлопец. Гэта херня, але звалі яго Руслан Тахіравіч Гасанаў. Якая нафіг паліткарэктнасць магла існаваць у нашай суровай барысаўскай вёсачцы. Натуральна, што «азера» сваім мы прызнаваць не хацелі. П...ілі Гасана бы ката. Але ведаеце, чым ён заслужыў нашу павагу? Тым, што ніколі не здаваўся, біўся да апошняга, незалежна ад таго, хто быў супернікам, хай хоць Новік. Ніколі не плакаў і не скардзіўся. Тым самым праз нейкі час ён дамогся нашай павагі.

У мяне быў толькі адзін момант, калі я заслужана атрымаў у морду. Было першынство вёскі па футболе. Гулялі наша каманда Нізінкі і Гара. Сустрэча было роўнай, і ўсё мог вырашыць адзіны гол. Мы заслужылі права на пенальці, але супернікі спрачаліся. Я на нервах не вытрымаў і паслаў Пашу Вяршка на..., простым тэкстам. Не паспеў апомніцца, як адчуў удар у зубы. На гэты раз усе засталіся цэлымі, але нас абодвух выдалілі з поля. Дарэчы, матч той па серыі пенальці мы выйгралі.

Апошні раз біўся, калі вучыўся ў каледжы. Хлапец адной з аднагрупніц прыраўнаваў Ірэну да мяне. Неяк у сакавіку вычакаў мяне пры ўваходзе, я акурат вяртаўся з секцыі па баскетболе. Ён прапанаваў пайсці пагаварыць. Адышлі за будынак. Ён пачаў вучыць мяне, каб я трымаўся ўбаку ад Іры, а пасля раптоўна ўдарыў у вока. Нядоўга думаючы, таксама засандаліў яму пад дых. Крыху пакачаліся. Не сказаць, каб ён мяне адтырыў, але быў відавочна здаравейшы. З таго моманту я яго пабойваўся, але з Ірай менш кантактаваць не стаў.

Хаця ўспомніў, што сам па мордзе апошні раз біў гады чатыры таму. Маці маёй тадышняй дзяўчыны працавала загадчыцай клубу. У будныя дні хлопцы збіраліся ў клубе, каб пагуляць у більярд. Пасля часта мы з дзяўчынай прыходзілі, каб забраць ключы і замкнуць клуб. Звычайна нікога не падганялі. Але ў той вечар быў важны матч маладзевага першынства Еўропы па футболе. І я, натуральна, хацеў дадому. Пацаны ж дадому не хацелі. Давялося падысці і ў наглую выключыць магнітафон. Падарваўся Андруха Пэспел. Неяк машынальна адразу загрэў яму ў ...ло, напэўна, пераўзбуджаны занадта быў. Думаецца, што хлопцы разам маглі б мяне закачаць лёгка, але не сталі ганьбіць у прысутнасці дзяўчыны, і на тым дзякуй.

Часам шкадуеш, што ў Менску нельга жыць паводле вясковых правілаў. Выйсці на разы часам было б куды лягчэй, чым гадамі захоўваць нейкія крыўды. Дык і адрэналін яшчэ той, менш негатыву застаецца.



# Утаямнічаныя

**На 117-годдзе з дня народзінаў Максіма Багдановіча ў Менску прайшла прэм'ера містэрыі «Дзень Максіма». Імпрэсія Паўла Касцюкевіча.**

А зала чакала. Грамадзянскую вайну, руска-польскую вайну, калектывізацыю, Другую сусветную, Халакост, стрэс вёскі, Чарнобыль. Сярод лірычных русалчыных спеваў, сярод вадзянікаў і лесуноў. Бо надта тое было смутна і радасна ўваднaчассе. Як сненне. Як тое, што не можа быць на гэтай зямлі. Як быццам зніклі Сцыла і Харыбда, і Адысэй вольны ў моры.

Заўсёды ўражвала багацьце беларускай мовы для апісання аднаго стану душы: жалобны, журботны, маркотны, смутны, сумны, тужлівы. Але тут мова бездапаможна маўчала — гаварыў паэт.

Але зала чакала. Чужое сілы, якае перарве бялюткія прасціны, што луналі заглушыць шчымлівыя згукі блакіту панад зямлёй. Чакала бота на горла.

А бота не было. Містэрыя без акупацыі жыла сваім жыццём. Не прасякаючыся з рэальнасцю, з гісторыяй.

Рэчаіснасць выявілася бляднейшай ў параўнанні з узвівам фантазіі і неяк так сарамяжліва схавалася ў прыпечку. Заазвычай надакучлівая зязюля гэтым разам зрабіла выгляд, што яна стравус. Усе гадзіннікі спыніліся і цыферблаты сцяклі долу. Гэта нагадвала вырай, як яго апісваюць у марах.

Я хацеў бы спаткацца з Вамі<br>
на вуліцы<br>
У ціхую сінюю ноч<br>
І сказаць:<br>
«Бачыце гэтыя буйныя зоркі,<br>
Ясныя зоркі Геркулеса?<br>
Да іх ляцiць наша сонца,<br>
І нясецца за сонцам зямля.<br>
Хто мы такія?<br>
Толькі падарожныя, — папутнікі сярод нябёс.<br>
Нашто ж на зямлі<br>
Сваркі і звадкі, боль і горыч,<br>
Калі ўсе мы разам ляцім<br>
Да зор?»

Ці ўяўляеце вы Багдановіча без вусоў? Ці ўяўляеце па-іншаму, не з таго школьнага партрэту, калі Максім у шынялі?..

Бог няроўна дзеліць.

Вось і наша дваццатае стагоддзе падзяліў на дзве такія няроўныя палоўкі. Да сямнаццатага году і пасля. Да смерці Максіма і пасля яе.

Багдановіч жыў, можа, у перадбур'і, але ў адносным бясчассі. Дзякуй Табе, яму не давялося, як іншым нашым тытанам бегчы навыперадкі з часам, моў Самсон змагацца з ім, напінаючы нерв, ашукваючы, паддобрываючыся, здраджваючы сабе і блізкім, прыносячы яму крывавыя ахвяры. Напэўна, проста пашчасціла. Паглядзіце які ён слабы.

Дзякуй Табе, што не паклаў Максіма ў пракрустаў ложак дваццатага стагоддзя, а таму ён не мог быць «пралетарскім», «прагрэсіўным», пракручаным вакол уласнай восі, з прастрэленым у патыліцы чэрапам.

Дзякуй: яго не паспелі змусіць уласнымі рукамі зруйнаваць гэты нябачны, але такі моцны мур паміж творцам і астатнімі людзьмі.

«Дзень Максіма» — персаніфікацыя, увасабленне, утаямнічванне. Рытуал пераходу Максіма з адной якасці ў другую, калі ён завіслы ў пераходзе, імкнецца ўцелавіцца ў нас.

Можа, трохі вагаючыся (ці варта?), так і стаяў(ла) ён (яна) на сцэне. Дзе няма часу, дзе блытаюцца мужчынскае і жаноцкае, дзе мама вечна маладая, дзе Беларусь маладая. ...Я не самотны...

Смерці няма.




Гісторыя, аналітыка, літаратура

у інтэлектуальным часопісе ARCHE — штомесяц.

Падпісны індэкс 00345

# Божае нараджэнне ў Мінску абвесцяць «Троіца» і «Палац»

Анёламі-апавяшчальнікамі цуду Божага нараджэння ў гэтым годзе ў сталіцы будуць два легендарныя фальклорныя гурты — этна-трыо «Троіца» і ансамбль беларускага кантры «Палац». Абодва вядомыя калектывы дадуць сольныя канцэрты, дзе абяцаюць увесці згаладалага па каляднай містыцы і містэрыі слухача ў атмасферу вясковага свята, вядзьмарства і чарадзейства.

«Троіца» прайшлася па гродзенскіх і брэсцкіх вуліцах, даўшы ў кожным з гарадоў па перадсвяточным канцэрце. Праўда, так і не пакінуўшы за сабой талых снежных слядоў, па якіх можна было б акурат у дзень Раства дабрацца да сталічнага КЗ «Мінск». 25 снежня прадзюсерскі цэнтр «ПАН-студыя» ладзіць там вялікі сольны вечар этна-каралёў.

Іван Кірчук — спецыяліст па абрадавай дзейнасці і непапулярным беларускім фальклоры, збіральнік напеваў і элементаў спрадвечнага вясковага быту — разам са сваім гуртом у святы дзень верне гледачоў да спрадвечнага, да традыцыі і каранёў, даўно пахаваных пад стракатымі гірляндамі і бліскучымі падарункамі ад заходняга Санты і савецкіх Снягурачак.

Апроч звыклых гукавых медытацый, дзе цягучы вакал Кірчука пераплятаецца з аб'ёмнымі ўдарамі бубна, звыклым спевам жалейкі, ціхімі перашэптамі, перазвонамі, енкамі, шоргатам, 25 снежня будуць выкананы кампазіцыі з новага і яшчэ не выдадзенага альбому «Жар-Жар», які мае стаць нязвыкла рокавым.

Ансамбль «Палац» ладзіць двухдзённае зімовае свята Божага нараджэння. 24 снежня, на Куццю, ў канцэртнай зале Тэатра эстрады адбудзецца VIP-канцэрт гурта, на які будуць запрошаны вядомыя асобы і прадстаўнікі СМІ. Назаўтра ж «Палац» склікае на канцэрт усіх сваіх сяброў, папулярных музыкаў, а таксама прыхільнікаў, каб адзначыць Каляды разам.

Цэлы шэраг гуртоў, у аснове музыкі якіх ляжыць цнатлівая аўтэнтыка, вырашылі 25 снежня зладзіць супольны карнавальны «Калядны фэст». У першы дзень Вясёлых Святаў у клубе «Рэактар» збяруцца рэканструктары музычнай традыцыі Вялікага Княства «Стары Ольса», стваральнікі «драйвовай сярэднявечнай музыкі» Litvintroll, паган-фолк-бэнд Znich, музычныя рэканструктары сярэднявечнай культуры Testamentum Terrae, этна-гурт «Рада» і сайд-праект флейтыскі ды дударкі «Старога Ольсы» — гурт Rosalia.

Па-за сталіцай святочныя увесяленні не будуць так моцна прывязанымі да народнай культуры і старажытнай традыцыі. У Горках пройдзе грандыёзны і гучны двухдзённы фестываль «Рок-Каляды». Гэты фэст існуе з 2001 году пад лозунгам «Мы па-за палітыкай і па-за грашыма».

25 снежня — конкурсны дзень. Абраны пераможца возме ўдзел у гала-канцэрце на наступны дзень, яму прэзентуюць 12 гадзінаў запісу ў студыі GS RECORDS і права ўдзельнічаць у фестывалі Mass Medium Fest 2009 у Магілёве.

Магчыма, у знак таго, што ў Беларусі ўсё яшчэ прынята найзычлівейшыя віншаванні і падарункі ў шалёсткай абгортцы дарыць ды атрымліваць у Навагоднюю ноч, беларускія гурты робяць свой святочны падарунак менавіта на Каляды. Яго не пакладзеш пад ялінку, так што трэба паспяшацца і паспець атрымаць усё самае лепшае, што айчынны фолк і рок здолелі зрабіць для нас цягам гэтага доўгага 2008 году.

**Адэля Дубавец, naviny.by**




**Кустурыца ў Мінску**

**19 снежня ў Палацы рэспублікі** выступіць славуты балканскі рэжысёр і музыка Эмір Кустурыца з сваім гуртом **No Smoking Orchestra**. **Пачатак у 19.00.**



**Міхась Сеўрук. Купальніцы.**

**Драздовіч, Сергіевіч, Сеўрук і ўсе-ўсе-ўсе**

**У Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі** 16 снежня адкрылася выстава ARS incognita, на якой дэманструецца творчасць мастакоў Заходняй Беларусі першай паловы XX стагоддзя — выпускнікоў мастацкіх навучальных установаў Вільні. У экспазіцыі прадстаўлены 142 работы Язэпа Драздовіча, Сяргея Вішнеўскага, Дзмітрыя Крачкоўскага, Пятра Сергіевіча, Міхася Сеўрука, Васіля Сідаровіча і Паўла Южыка. Гэта пейзажы, партрэты, тэматычныя карціны, эскізы роспісаў храмаў, гравюры і разьба па дрэве, якія захоўваюцца ў прыватных калекцыях. **Выстава працуе да 25 снежня. Адрас: вул. Сурганава, 1, корп. 2.**

**БелаПАН**

## ВЫСТАВЫ

**Барысаўскія калядкі**

**Да 21 снежня ў Барысаве** праходзіць універсальная выстаўка-кірмаш «Барысаўскія калядкі». На выстаўцы будуць прадстаўленыя разнастайныя тавары, якія ў першую чаргу шукаюць пакупнікі перад Калядамі і Новым годам. Гэта навагоднія сувеніры, цацкі, дэкаратыўна-прыкладныя і мастацкія вырабы, ялінкі, посуд.

**Дудар беларускі**

**У Палацы мастацтва (Казлова, 3) да 21 снежня** працуе выстава, прымеркаваная да 200-годдзя з дня народзінаў Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Дудар беларускі». На выставе будуць прадстаўленыя творы мастакоў, выкананыя ў разнастайных тэхніках: жывапіс, графіка, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

**Нябесныя бегі**

**У Палацы мастацтва да 21 снежня** працуе выстава «Нябесныя бегі», прымеркаваная да 120-годдзя з дня народзінаў Язэпа Драздовіча.

**М'янма. Сезон дажджоў**

**У кінатэатры «Перамога» да 20 снежня** ідзе фотавыстава Пятра Казельца «М'янма. Сзон дажджоў». На здымках — рэальнае жыццё М'янмы, ламентальныя партрэты і сцэнкі будзённага жыцця.

**Выставы сцэнічнага касцюму**

**У Мастацкім музеі да 19 студзеня** працуе выстава сцэнічнага касцюму дзяржаўнага харэаграфічнага ансамблю «Харошкі».

**Фатаграфічная экспедыцыя: на захад ад Мінску**

**У галерэі NOVA (В.Харужай, 16) да 13 студзеня** працуе выстава «Фатаграфічная экспедыцыя: на захад ад Мінску».

**Карнавал**

**Да 12 студзеня ў Мастацкім музеі** працуе выстава «Карнавал» беларускага мастака Андрэя Смаляка.

**Чароўныя сны**

**У галерэі твораў Л.Шчамялёва да 4 студзеня** працуе выстава жывапісу Ганны Балаш і Аляксея Гаявога «Чароўныя сны».

## КАНЦЭРТЫ

**Інтэрферэнцыя**

**25 снежня ў клубе Night Star (Свярдлова, 2)** — фестываль «Інтэрферэнцыя».

**Рокаш**

**23 снежня ў «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — канцэрт «Рокашу».

**Сярэднявечная дыскатэка ў Віцебску**

**«Стары Ольса»** запрашае на сярэднявечную дыскатэку, якая адбудзецца **20 снежня ў Віцебску ў клубе «Зебра»**. У праграме таксама запланаванае сярэднявечнае танцавальнае шоу ад гурту сярэднявечнай рэканструкцыі «Паўночная вежа». **Пачатак а 17-й.**

**Калядны фэст**

**25 снежня ў «Рэактары»** — Калядны фэст. Бяруць удзел: **«Стары Ольса»**, **Litvintroll**, **Znich**, **Testamentum Terrae**, **«Рада»**, **Rosalia** і іншыя.




**Альгерд Бахарэвіч. Сарока на шыбеніцы. Раман** — Мінск: Логвінаў, 2009

**Сарока на шыбеніцы**

Прэзентацыя новай кнігі Альгерда Бахарэвіча «Сарока на шыбеніцы» адбудзецца **19 снежня а 19-й у мінскай галерэі «Падземка» (пр. Незалежнасці, 43)**.

# Выставы Вялікіх

**Тое, што пры Машэраву падавалася трыюмфам Беларушчыны, сёння — шараговая падзея.**

**У мінскім Палацы мастацтваў (вул.Казлова, 3)** адкрыліся дзве выставы. Першая прысвечаная мастаку Язэпу Драздовічу. Другая — літаратару Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу.

Класік наш, Дунін-Марцінкевіч, нарадзіўся ў фальварку Панюшкавічы, што цяпер на Бабруйшчыне, 4 лютага 1808 г. Не прайшло і году з дня ягонага юбілею, як і мастакі наважыліся далучыцца да ўрачыставанняў. Выставу «Дудар беларускі» да 200-годдзя пачынальніка новае беларускай літаратуры, заснавальніка нацыянальнае драматургіі і тэатру арганізатары вырашылі сумясціць з невялікай выставаю да 120-годзьдзя Язэпа Драздовіча, што зладзіла мастакоўская суполка «Пагоня».

На Дунінаўскай выставе сабралі блізу пяці дзясяткаў твораў: жывапіс, графіка, плакат, літаграфія і скульптура. Прадстаўленыя работы славутых майстроў — Віктара Маркаўца, Ігара Марачкіна, Яўгена Шатохіна, Міколы Аўчыннікава, Ігара Алексіевіча...Тутака прадстаўленыя і вядомы партрэт пісьменніка, напісаны Аляксеем Марачкіным, літаграфія «Пінская шляхта» Уладзіміра Савіча, класічная серыя работ Міколы Купавы, прысвечаная героям паўстання 1863 і багата чаго яшчэ, пазнавальнага і добра ведамага...

Многія творы я памятаю яшчэ з часоў БССР, з Рэспубліканскай выставы, прысвечанай 175-годдзю з дня народзінаў Дуніна-Марцінкевіча. Тая праходзіла тутсама, у Палацы мастацтва. Тады, гэта выглядала сапраўдным трыюмфам Беларушчыны. У той грандыёзнай выставе удзельнічалі больш за 100 мастакоў і прадстаўленыя былі больш як 160 твораў. У часы БССР, калі зборы твораў гэтага класіка выходзілі і ў 1940, і ў 1945, і ў 1984, гэта выглядала цалкам натуральна. Сярод урачыстага тлуму той выставы ў маёй свядомасці Беларушчына й Мастацтва зніталіся ў непадзельнае цэлае…

Гэтым разам, пасля ўрачыстага адкрыцця, пасля выступу «Беларускай капелы» з музыкай XIX ст., запанавала гнятлівая ціш. Толькі пры ўваходзе, у фае, вакол гандляроў кнігамі і CD увіхаюцца пакупнікі…

Самаахвярныя высілкі нашых культурнікаў за чвэрць стагоддзя мала што змянілі ў грамадстве. Нацыянальная культура застаецца па ранейшаму справаю меншасці. Выдатныя творы выдатных майстроў гэтак і не занялі вартага месца ў нацыянальных музеях. Зрэшты, і музею Дуніна-Марцінкевіча ў нас няма. А дом на вуліцы Рэвалюцыйнай, былой Койданаўскай, у якім ён жыў, акурат год таму знеслі…

А справа перахоўвання памяці пра Язэпа Драздовіча і яе шанаванне, стала прыватнай справаю Ады Райчонак і суполкі «Пагоня»…

Тым важней убачыць тое, што яны прадставілі для нас у Палацы мастацтваў. Мо хто з дзяцей захопіцца гэтым чароўным светам? Светам Беларушчыны й Мастацтва.

**Абедзве выставы прадоўжацца да 21 снежня.**

**СХ**

## СПЕКТАКЛІ

**Купалаўскі тэатр**

**19 (пт)** — «Вольга»
**20 (сб)** — «С.В.»
**30 (аўт)** — «Паўлінка»
*ранішнія спектаклі*
**29 (пн), 30 (аўт)** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
*малая сцэна*
**21 (ндз), 22 (пн)** — «Дзікае паляванне караля Стаха»
**27 (сб), 28 (ндз)** — «Дамскае танга»

# «Белсат»: тэлепраграма на 22—28 снежня
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал




## 22 снежня, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, І выданне)

**18.10** «Ранча», серыял, 5 серыя

**19.00** «Кіно ды катлеты», дак. фільм, рэж. Вольга Нікалайчык, 2008 г., Беларусь

**20.10** Імпрэза гурту Svet Boogie Band на Фестывалі беларускай культуры і мастацтва (Варшава, 2008)

**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода»

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)

**21.15** Віртуальная помпа: агляд Сеціва

**21.30** «Перапісанае жыццё» (Stranger than Fiction), маст. фільм, рэж. Марк Форстэр (Marc Forster), 2006 г., ЗША. У галоўнай ролі Дастын Гофман (Dustin Hoffman).

**23.20** «Элі Макбіл», тэлесерыял: ІІ сезон, 22 серыя

**00.00** Аб'ектыў (навіны)

## 23 снежня, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, І выданне)

**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: ІІ сезон, 22 серыя

**18.55** «Тры таварышы» (Drie kameraden), дак. фільм, рэж. Маша Новікава (Masha Novikowa), 2006 г., Галандыя

**20.40** YoLife!

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)

**21.15** «Без рэтушы»: «Чатыры сымбалі», дак. фільм, 2008 г., Беларусь

**21.45** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»

**22.10** Ток-шоу «Форум»: Як абараніцца ад крызісу?

**23.00** «Элі Макбіл», тэлесерыял: ІІ сезон, 23 серыя

**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы

**00.00** Аб'ектыў (навіны)

## 24 снежня, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, І выданне)

**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: ІІ сезон, 23 серыя

**19.00** Праект «Будучыня»: навуковы агляд каналу «Нямецкая хваля»

**19.25** «Старыя Кросны», дак. фільм, рэж. Юрый Выдронак, 2007 г.

**19.45** Бульбаны

**19.55** Рэпарцёр

**20.30** «Каляды, Каляды», ч. 1, 2007 г., Польшча

*Беларускія музычныя зоркі спяваюць традыцыйныя і сучасныя калядныя песні.*

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)

**21.15** «Хто кахае» (Those Who Love), маст. фільм, рэж. Ізабэль Куаксэ (Isabel Coixet), 1998 г., Іспанія—Францыя. У ролях: Моніка Бэлючы (Monica Bellucci), Крыстафэр Томсан (Christopher Thomson), Алялля Марэна (Olalla Moreno).

*Фільм створаны паводле раману Стэндаля (сапр. Анры-Мары Бэйль). Ізабэль Куаксэ ўдалося не толькі экранізаваць твор французскага класіка, але і сабраць для здымак выдатную каманду. Цудоўная ігра актораў, прафесійная апаратарская работа і дасканалая музыка ствараюць гарманічнае цэлае.*

*Гэты твор пра рамантычнае каханне быў натхнёны пачуццём самога Стэндаля да маладой жанчыны на імя Матыльда. Самую Матыльду грае Алялля Марэна, ствараючы незвычайны кантраст з другою акторкаю — Монікаю Бэлючы, а таксама з іншымі акторамі фільму. І гэта сапраўды мастацкая кінапаэма.*

**22.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы

**23.05** «Мент», дэтэктыўны серыял, 6 серыя

**00.00** Аб'ектыў (навіны)

## 25 снежня, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, І выданне)

**18.15** «Мент», дэтэктыўны серыял, 6 серыя

**19.10** «Розныя светы», дак. фільм, рэж. Марка Скоп (Marko Skop), 2005 г., Славакія

*Дакументальны фільм пра шматэтнічную культуру Славакіі, дзе ў адным мястэчку можна спаткаць славакаў, венграў, цыганоў, габрэяў і немцаў.*

**20.30** Жаўтуха

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)

**21.15** «Вызваленне», ч. 1, дак. фільм, рэж. Вольга Нікалайчык, 2008 г., Беларусь

*Кадры сучаснай хронікі (аматарскія здымкі з архіву аўтаркі): вёска Дражна Мінскай вобласці. Група людзей пад дажджом нясе вялізны драўляны крыж, кладуць яго на воз і вязуць у кірунку могілак. Але там іх ужо чакае... мясцовая міліцыя ў цывільным. Людзі пачынаюць ставіць крыж ахвярам савецкіх партызанаў (падчас вайны ў гэтым месцы з асаблівай жорсткасцю былі забітыя 25 жанчын, дзяцей і старых). Партызаны, дакладней, засланая з Масквы дыверсійная група, разграмілі мясцовую самаахову, якая складалася з грамадзянскага насельніцтва... Міліцыя папярэджвае, што ўсталёўваць крыж не дазволена, але людзі, нягледзячы на папярэджанне, ставяць крыж, прымацоўваюць на ім памятную таблічку, ускладаюць кветкі, моляцца і сыходзяць. Сярод іх — Вячаслаў Сіўчык — ініцыятар акцыі, які пасля быў арыштаваны і асуджаны за арганізацыю і ўдзел у акцыі ўсталявання крыжа пры дражненскіх могілках.*

**21.55** «Змоўкні!», маст. фільм, рэж. Франсіс Вэбэр (Francis Veber), 2003 г., Францыя. У ролях: Жэрар Дэпард'ё (Gerard Depardieu), Жан Рэно (Jean Reno).

*Рэспектабельны гангстэр Рубі (Жан Рэно) трапляе ў вязніцу. Яго змясцілі ў камеру разам з Куэнтэнам (Жэрар Дэпард'ё) — дзіўнаватым крымінальнікам, які сваёй няспыннаю балбатнёю даводзіў усіх да шаленства. Рубі рыхтуе незвычайны план уцёкаў. Але неспадзявана ў дзень здзяйснення гэтае задумы яго збівае Куэнтэн. На свабоду вырываюцца абодва сукамернікі...*

**23.20** Наша сцэна: канцэрт гурта «Тройца», ч. 1

**23.50** «Мент», дэтэктыўны серыял, 7 серыя

**00.40** Аб'ектыў (навіны)

## 26 снежня, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, І выданне)

**18.10** «Мент», дэтэктыўны серыял, 7 серыя

**19.10** Таўкачыкі на Божае Нараджэнне, ч. 1

**19.30** «Пейзаж», дак. фільм, рэж. Сяргей Лазніца (Sergiei Loznitsa), 2003 г., Германія

*Суровая зіма. Расійская правінцыя. На аўтобусным прыпынку мерзнуць людзі. Размаўляюць пра сваё жыццё. Кожны мае сваё няшчасце. Кожны змагаецца з праблемамі. Ніхто не задаволены са свайго жыцця. Вось сумны вобраз сучаснай Расіі.*

**20:00** Жаўтуха

**20.35** «Першы дзень», дак. фільм, рэж. Марцін Саўтэр (Marcin Sauter), 2008 г., Польшча

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)

**21.15** «Здарэнні з хронікі каханння» (Kronika wypadkow milosnych), маст. фільм, рэж. Анджэй Вайда (Andrzej Wajda), 1985 г., Польшча. У ролях: Паўліна Млынарска-Морыц (Paulina Mlynarska-Moritz), Пётр Ваўжыньчак (Piotr Wawrzynczak), Тадэуш Канвіцкі (Tadeusz Konwicki).

*Сентыментальнае падарожжа ў краіну маладосці, убачанай праз прызму ўспамінаў. Назаўсёды страчаны рай дзяцінства з'яўляецца міфічным вобразам памяці, да якога вяртаешся ў думках усё дарослае жыццё. Сцэнар напісаў Тадэуш Канвіцкі на падставе ўласнага раману, выдадзенага ў 1974 г.*

*Дзеянне адбываецца ў Вільні ў 1939 г., напярэдадні ІІ сусветнае вайны. Выпускнік Вітэк закахаўся ў Аліну, дачку палкоўніка Налэнча. Вольны час хлопец бавіць пераважна з сябрамі: Энглем, Лёвам і закаханаю ў яго Энглеваю сястрою — Грэтаю. Тым часам Вітэк марыць паспяхова здаць экзамены, каб паступіць на медычны факультэт, і ўзяць шлюб з Алінаю. Сям'я каханай нават не здагадваецца пра яе спатканні з Вітэкам. Нечаканая хлопцава рашучасць пераконвае Аліну, якая пачынае верыць у яганае каханне. Яны ўжо размаўляюць пра шлюб, плануюць уцёкі пасля абвешчання вынікаў экзаменаў. Аднак Вітэк не атрымлівае атэстату сталасці і даведваецца, што сям'я Аліны едзе за мяжу. На апошняе спатканне Аліна апранае белую сукенку. Адносіны паміж імі даходзяць да першае блізкасці; стомленыя каханкі засынаюць у абдымках. Ранкам іх будзяць артылерыйская кананада — пачынаецца вайна...*

**23.15** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы

**23.30** «Пітбуль», серыял, 6 серыя

**00.15** Аб'ектыў (навіны)

## 27 снежня, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, І выданне)

**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»

**18.40** «Эстонія, маё каханне», маст. фільм, рэж. Сібіле Тыдэман (Sybille Tiedemann), 2004 г., Германія.

*Рэжысёрка выбіраецца ў падарожжа па Эстоніі слядамі свайго старэйшага брата. Фільм пра сустрэчу з таямнічым месцам на зямлі, з Эстоніяй, пра пошукі сэнсу жыцця, пра развітанне і пра радасць, якую даюць новыя пачынанні.*

**20.15** Госць «Белсату»: Пятрушка Шустрава, былая чэшская дысідэнтка, а пасля — намесніца міністра ўнутраных справаў Чэхіі.

**20.30** Падземка (беларускі хітпарад)

**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)

**21.15** Маю права (прававаая праграма)

**21.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»

**22.10** «Пяцёра дзетак і Пескавік» (Five Children and it), рэж. Джон Стывэнсан (John Stephenson), 2004 г., Вялікая Брытанія—ЗША

*Пяцёра сімпатычных дзяцей прыбываюць да таямнічага замчышча свайго застрэленага дзядзькі. Падчас гульні на найнайбліжэйшым пляжы ім з'яўляецца НЕШТА незвычайнае! Гэта нейкі Жыццязаўр (Пескавік) або чароўнае стварэнне, якое можа выканаць любое жаданне. Так пачынаецца захапляльная прыгода. У дзяцей выяўляецца вельмі маляўнічая фантазія, а іх шалёныя жаданні пачынаюць сапраўды здзяйсняцца.*

**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы

**00.00** Аб'ектыў (навіны)

## 28 снежня, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс: агляд беларускага друку

**18.15** Жаўтуха

**18.40** «Ранча», серыял, 6 серыя

**19.35** Кухня (музычная праграма)

**20.05** «Аблічча смерці» (Facing the Dead), дак. фільм, рэж. Карл Людвіг Рэтынгер (Carl Ludwig Rettinger), Габрыеле Пфайфэр (Gabrielle Pfeiffer), 2005 г., Германія—Расія

*Калі Сталін кіраваў Савецкім Саюзам, пад пагрозаю смерці былі забароненыя фотаздымкі 20 млн рэпрэсаваных людзей, т. зв. ворагаў народу, расстраляных ці пасланых у канцлагеры. Сем'і замалёўвалі выявы сваіх блізкіх на сямейных групавых партрэтах, школьнікі выкрэслівалі рэвалюцыйных герояў з падручнікаў гісторыі, а тое, што заставалася, данішчалі энкавэдысты. У гэтай стужцы аўтары па здымках імкнуцца аднавіць гісторыю загубленага пакалення.*

**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)

**21.20** Ток-шоу «Форум»: Хто накорміць Беларусь?

**22.05** «Зямля запаветная» (Ziemia obiecana), маст. фільм, рэж. Анджэй Вайда (Andrzej Wajda), 1974 г., Польшча

*Канец XIX стагоддзя, польскі горад Лодзь. Трое сяброў — паляк Караль Баравецкі, немец Макс Баўм і габрэй Морыц Вэльт — будуюць суконную фабрыку. Ім здаецца, што яны схапілі фартуну за бараду. Аднак фабрыка згарае ў пажары — падпал учынілі на загад іншага прамыслоўцы, жонка якога мілавалася з Каралем. Малады чалавек адкідае шляхецкі гонар, развітваецца з нарачонаю і жэніцца з дачкою фабрыканта-габрэя Мюлера.*

**00.50** Аб'ектыў (вынікі тыдня)

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Што трэба ведаць пра панікёраў

**Як сцвярджае Нацбанк, у краіне з'явілася новая катэгорыя злачынцаў — панікёры. Гэта яны сеюць у чэргах да абменнікаў беспадстаўныя плёткі наконт хуткага падзення рубля. Фельетон Лёліка Ушкіна.**

*(Лекцыя для супрацоўнікаў аддзелу хуткага рэагавання Нацбанку, накіраваных у чэргі да абменнікаў для нейтралізацыі панікёраў).*

Катэгорыя злачынцаў «панікёры» адносна маладая сярод іншых крымінальных субкультураў (злодзеі, картачныя круцялі, шлюбныя аферысты), аднак вельмі небяспечная.

На самай вышыні злачыннай структуры панікёраў стаіць панікёр у законе, або «папахан» (ад словаў «панікёр» плюс «пахан»).

Прадстаўнікі гэтай касты абавязаныя панікаваць увесь час. Панікёр у законе бачыць прыкметы фінансавага крызісу нават у такіх звычайных з'явах, як просьба ўраду да Расіі даць яшчэ адзін мільярдны крэдыт або словы Кіраўніка пра тое, што 2009 год будзе цяжкім.

Панікёр у законе ніколі не возьме ў рукі рубель: ён лічыць, што заўтра беларускую валюту чакае непазбежны дэфолт.

Паколькі панікёры ў законе ўвесь час панікуюць, ім цяжка выходзіць з хаты. Панікаваць у чэргі да абменнікаў ходзіць іншая група панікёраў, г. зн. «прыпанікаваныя». Дзейнічаюць яны так: пытаюць, ці ёсць у продажы даляры? Даведаўшыся, што валюты няма, робяць вялікія вочы: як гэта ў касе няма валюты, калі фінансавы крызіс, як піша «Саўбелка», нам не пагражае? Іншымі словамі, злачынец панікуе. Ахвярамі злачыннага ўчынку становяцца прысутныя ў чарзе. Яны пачынаюць панічна скупаць даляры і еўра замест таго, каб наадварот здаваць іх.

Для згаданай катэгорыі злачынцаў характэрныя свае знадворныя коды. Асаблівую ўвагу раім звярнуць на татуіроўкі: выява мёртвага зайчыка (сімвал будучыні рубля). Лічба 2200 і крыж (або плюс) — на іх злачынную думку, курс даляра мусіць вырасці больш чым на 2200 рублёў і да вясны дасягне 3—4 тысяч і г. д. У лексіцы злачынцаў прысутнічаюць жарганізмы. Напрыклад: «Беларускі рубель — слабая валюта», «Беларуская гаспадарка — нерэнтабельная эканамічная мадэль, якая трымаецца на падачках Расіі».

Але дзяржава трымае сітуацыю пад кантролем. Каб не дапусціць выкліканых панікёрамі спекуляцый наконт таго, што даляр будзе да вясны каштаваць 3—4 тысячы рублёў, мы апусцім яго да 5000. Гэта, безумоўна, нанясе моцны ўдар па аўтарытэце панікёраў і іх арганізаваных структурах.

# Доктар Алкаголь

**Віктар Жыбуль**

Добры доктар Алкаголь —
Ён усім здымае боль!
Да яго прыходзь лячыцца
і цясляр, і кранаўшчыца,
і прафесар, і студэнт,
і паэт, і прэзідэнт.
Паздзімае з ранаў соль
добры доктар Алкаголь!

І прыйшоў да Алкаголя Пятро:
— Мяне зашчымілі ў метро!
І прыйшла да Алкаголя Тэрэза:
— Мяне ледзьве маньяк не прырэзаў!
І прыйшоў да Алкаголя Піліп:
— Я ў махінацыю ўліп!
І прыйшоў да Алкаголя Хвядос:
— Мне надакучыў мой бос!
І прыйшоў да Алкаголя Серж:
— У мяне не пішацца верш!
І прыйшлі да Алкаголя дзве Ганны:
— Мне з ёю здрадзіў каханы!
І прыйшоў да Алкаголя Дзям'ян:
— Мне паламалі баян!

І прыйшла да Алкаголя Марынка:
— Мне нехта ў паштовую скрынку
падкінуў дохлую мыш.
Ні паеш,
ні спяеш,
ні паспіш!

І прыйшоў да Алкаголя Якуб:
— Мне акунуцца ў раку б...
Ды сорамна мне,
што не ўзяў я плаўкі.
Доктар, я патрабую дабаўкі!

І прыйшла да Алкаголя Канстанцыя:
— У мяне пад акном будуецца
атамная электрастанцыя,
а мне спакой патрабуецца...

І прыйшоў да Алкаголя Максім:
— Я не задаволены ўсім!
І прыйшла да Алкаголя Таня:
— Быць агідна ў цвярозым стане!
І прыйшоў да Алкаголя Пятрусь:
— Мне балюча за ўсю Беларусь!
А потым прыйшоў Альфрэд:
— Мне крыўдна за цэлы сусвет!

Добры доктар Алкаголь,
ускараскай нас на столь!
Разам з намі пасваволь,
добры доктар Алкаголь!

Каб па нашых родных хатах,
фабрыках і камбінатах,
школах і ваенкаматах,
па вакзалах і дэпо,
банках і ўнівэрсытэтах,
тэле, радыё, газетах
і раённых камітэтах
разьлілося Лімпапо!

**Віктар Жыбуль** адзін з найлепшых паэтаў пакалення 30-гадовых. У тым ліку і дзякуючы выдатнаму пачуццю гумару. Ён аўтар найдаўжэйшага паліндрому на славянскіх мовах (верша, які можна чытаць як з пачатку ў канец, так і з канца ў пачатак). Аўтар кнігі «Забі ў сабе Сакрата».




ЖАРТ




**Прынцып аднаго акна**

**Кліент:** «Дзякуй за наяўныя... І зрабіце, калі ласка, 2 ксеракопіі выявы наручнага залатога гадзінніка маёй жонкі. Ёй на памяць, бо, думаю, яна больш яго не ўбачыць».

**Лявон К**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ВІТАННІ**

**15 снежня споўнілася 80 гадоў** аднаму са старэйшых і вядомых беларускіх археолагаў, кандыдату гістарычных навук Уладзіміру Фёдаравічу Ісаенку. Шчыра віншуем! Калегі

**ІМПРЭЗА**

**20 снежня** адбудуцца літаратурныя чытанні ў сядзібе Таварыства беларускай мовы (вул.Румянцава, 13). Прэзентацыя кніг паэта Яўгена Гучка. Пачатак у 15-30. Уваход вольны.

**БЕЛАРУСКАМОЎНЫ САДОК**

**Шукаю бацькоў**, якія жадаюць з восені 2009 г. аддаць сваіх дзяцей 3-4 гадоў у беларускамоўны садок у мікрараёне Сухарава (Мінск). Арганізацыйныя (і кантрольныя) абавязкі бяру на сябе. Звязвацца: (029) 395-73-99 (Дар'я) або праз акаунты скайп і гмэйл — apalonik

**БЕЛАРУСКАЯ ЯЛІНКА!**

**Супольнасць «Нашыя дзеткі»** (dzietki.by), гурток «Праменьчык», тэатр «Жывое Слова» ласкава запрашаюць Вас і Вашых дзетак на беларускую ялінку! Свята адбудзецца ў суботу, 27 снежня, а 13-ай гадзіне ў Палацы дзяцей і моладзі на Старавіленскім тракце, 41 (корпус Б, 2 паверх, уваход з боку возера). Ад Вас чакаем: папярэдняга самазапісу (на форуме dzietki.by ці праз ліст на n.dzietki@yahoo.com), святочнага настрою і карнавальных строяў у дзетак і бацькоў. Дадатковая інфармацыя: (029) 632-27-43 (Крысціна), skype: kryscina, ICQ: 353 181 833; (017) 292-31-85 (Вольга), skype: mazurava

**ПРАЦА**

**Дапамажыце** з працай выкладчыку беларускай мовы. Не пашкадуеце! Т.: 294-13-38

**Праца** для студэнтаў. Т.: (029) 615-47-76

**ЧАСОПІС ARCHE ШУКАЕ РАСПАЎСЮДНІКА**

Ч**асопіс ARCHE** шукае распаўсюдніка. Занятасць — 3—4 гадзіны ў дзень (за выняткам выходных). Аплата здзельна-прэміяльная. Звяртацца на т.: (029) 550-79-69 (Валеры Булгакаў). Рэкамендацыі вітаюцца.

Прыватныя абвесткі ў «НН» (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Апошнія дні падпіскі. Не забудзьцеся падпісацца! Як тое зрабіць — старонка 2.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Мінск.** Разбіралася справа аб двух салдатах з канвойнай каманды, которыя вялі ў Ігумен у турму двух арыштантаў і адну кабету і пры гэтым згвалтавалі тую кабету. Тымчасам адзін арыштант уцёк. Тут салдаты спалохаліся і, каб схаваць канцы ў ваду, застрэлілі таго арыштанта, што застаўся, а пасля сказалі, быццам забілі яго бароняючыся. Але скрыўджаная кабета выдала іх, і суд абоіх прыгаварыў на вечную катаргу.

**«Наша Ніва» № 25, 1908**

Наступны нумар выйдзе **29 снежня**.
Радасных Вам Калядаў!

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5237. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 18.12.2008.
Замова № 7019.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12